БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ

# СНАПКОЎСКАЯ
# Святлана Валянцінаўна

## Да 70-гадовага юбілею
## і 45-годдзя навуковай і педагагічнай дзейнасці

### Біябібліяграфічны паказальнік

МІНСК
БДУ
2024

УДК 016:37(092)+37(476)(01)+012Снапковская С.В.
ББК 91.9:74+74-8(4Беи)я1
С53

Рэкамендавана
саветам факультэта сацыякультурных камунікацый БДУ
30 жніўня 2024 г., пратакол № 1

Складальнік
**С. В. Снапкоўская**

Рэцэнзенты:
акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук Рэспублікі Беларусь,
доктар гістарычных навук, доктар архітэктуры,
прафесар *А. І. Лакотка*;
кандыдат гістарычных навук, дацэнт *І. І. Янушэвіч*

С53 **Снапкоўская** Святлана Валянцінаўна: да 70-гадовага юбілею і 45-годдзя навуковай і педагагічнай дзейнасці : біябібліяграфічны паказальнік / склад. С. В. Снапкоўская. – Мінск : БДУ, 2024. – 83 с.

Выданне прысвечана навукова-педагагічнай дзейнасці вядомага беларускага педагога, гісторыка і культуролага, доктара педагагічных навук, доктара гістарычных навук, прафесара, прафесара кафедры культуралогіі факультэта сацыякультурных камунікацый БДУ Святланы Валянцінаўны Снапкоўскай. Прадстаўлены старонкі жыцця і творчасці вучонага і ўніверсітэцкага выкладчыка, аўтабіяграфічная інфармацыя, бібліяграфічныя паказальнікі.

**УДК 016:37(092)+37(476)(01)+012Снапковская С.В.**
**ББК 91.9:74+74-8(4Беи)я1**

© БДУ, 2024

# ЗМЕСТ

**АД СКЛАДАЛЬНІКА** ........ 4

**АЎТАБІЯГРАФІЧНАЯ І БІЯГРАФІЧНАЯ ІНФАРМАЦЫЯ** ........ 8

Асноўныя даты жыцця і творчасці ........ 8

Этапы навуковай дзейнасці ў кантэксце педагагічных, гістарычныхі культуралагічных даследаванняў ........ 11

Пра пераемнасць: традыцыі і наватарства ў гісторыка-педагагічных даследаваннях у БДУ і Беларусі ........ 18

Універсалізм двойчы доктара навук, прафесара С. В. Снапкоўскай у галіне гісторыі і тэорыі педагогікі, культуралогіі, гісторыі культуры Беларусі ........ 25

Аб асноўных напрамках і выніках навуковай дзейнасці ў галіне гісторыі адукацыі, культуры і педагагічнай навукі Беларусі ........ 34

**БІБЛІЯГРАФІЧНЫ ПАКАЗАЛЬНІК** ........ 45

Спіс навуковых прац прафесара С. В. Снапкоўскай ........ 45

Статьи в базе данных SCOPUS ........ 70

Газетныя артыкулы ........ 70

Сто асноўных навуковых прац С. В. Снапкоўскай ........ 71

Навуковая школа прафесара С. В. Снапкоўскай ........ 81

Літаратура аб жыцці і дзейнасці С. В. Снапкоўскай ........ 83

# АД СКЛАДАЛЬНІКА

Паважаныя чытачы, сябры і калегі! Перад вамі кніга, прысвечаная майму 70-гадоваму юбілею. Прафесару, вучонаму і выкладчыку звычайна ёсць што сказаць, калі за плячыма не адзін дзесятак гадоў жыцця і працы ў сістэме навукі і адукацыі. Для мяне пражыты час змясціў гады дзяцінства і юнацтва ў ваколіцах Астрашыцкага гарадка пад Мінскам і ў беларускай сталіцы, ранні пачатак працы пасля заканчэння школы старшай піянерважатай, вучобу ва ўніверсітэце, работу ў камсамоле, замуства і стварэнне сям'і, выкладчыцкую работу ў БДУ (ад выкладчыка да прафесара), аспірантуру і абарону кандыдацкай і доктарскіх дысертацый. Гэты час прыпадаў на савецкі перыяд у жыцці майго пакалення, які ўсё больш аддаляецца ва ўспамінах, рэфлексіях і пачуццях і дапаўняецца 33 гадамі жыцця ў незалежнай Беларусі.

1990-я гады напоўнены працай дацэнтам БДУ, адначасова загадчыцай лабараторыі Нацыянальнага інстытута адукацыі, загадчыцай кафедры Беларускага дзяржаўнага інстытута ўдасканалення ўрачоў, стажыроўкай у Інстытуце гісторыі НАН Беларусі і абаронай доктарскай дысертацыі па айчыннай, беларускай гісторыі. У гэты перыяд узыходзіў да вяршынь навукі муж Уладзімір, які пасля абароны доктарскай дысертацыі ў Інстытуце гісторыі НАН Беларусі перайшоў на працу прафесара ў БДУ, стварыўшы разам с іншымі прафесарамі кафедру, а потым факультэт міжнародных адносін. Наша сям'я папоўнілася другім сынам, а дзяцей нам дапамагалі гадаваць мае бацькі Мар'я Афанасьеўна і Валянцін Сямёнавіч.

Двухтысячныя, «нулявыя», прынеслі змены ў службовым становішчы. Спачатку працавала саветнікам рэктара БДУ, а затым – загадчыкам кафедры тэорыі і гісторыі культуры БДПУ імя Максіма Танка. Перастаноўкі мелі дабравольны характар, былі выкліканы прапановамі на павышэнне і рэалізацыю майго назапашанага адміністратыўнага патэнцыяла. Часткова яны дыктаваліся ўмовамі структурнай перабудовы ўніверсітэцкай сістэмы, калі кафедра тэорыі і гісторыі культуры БДПУ была ліквідаваная. З прычыны тагачаснай неадназначнай сітуацыі у педагагічнай навуцы Беларусі, доктару гістарычных навук аказалася часам не проста інтэгравацца ў існуючую сістэму падрыхтоўкі і дзейнасці кадраў вышэйшай кваліфікацыі па педагагічных навуках.

Існуючыя рэаліі падштурхоўвалі да рэалізацыі мары жыцця – навучання ў дактарантуры адной з лепшых навуковых установ СССР,

а затым Расійскай Федэрацыі па гісторыка-педагагічных даследаваннях – Інстытуце тэорыі і гісторыі педагогікі Расійскай акадэміі адукацыі. Ступені кандыдата педагагічных і доктара гістарычных навук разам з набытым статусам вядучага прадстаўніка гісторыка-педагагічных даследаванняў у Рэспубліцы Беларусь і вопытам навукова-арганізацыйнай дзейнасці ў галіне адукацыі, педагогікі і культуры давалі падставы для паспяховага здзяйснення пастаўленай высокай навуковай мэты. На працягу некалькіх гадоў бесперапыннай творчай працы мэта была дасягнута, нават не пабаюся выразу, «у сваё задавальненне» ў маскоўскіх і піцерскіх архівах і бібліятэках, шляхам абмеркаванняў і дыскусій з вядучымі расійскімі вучонымі, а таксама выступленняў на шматлікіх міжнародных канферэнцыях, навуковых семінарах, публікацый цыкла вакаўскіх артыкулаў у расійскіх часопісах, выдання манаграфіі аб развіцці адукацыі і педагагічнай думкі ў Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. I тут не абышлося без праблем, вядомага чалавечага фактара, які дабраўся з Мінска ў Маскву, каб нешта «насаліць» і перашкодзіць. Дзякуй добрым людзям, выбітным прафесіяналам, кіраўнікам федэральнай арганізацыі беларускай дыяспары ў Расіі і Маскве, вядучым беларускім і расійскім вучоным, якія падтрымалі і дапамаглі ў арганізацыі даследаванняў і правядзенні абароны доктарскай дысертацыі. Яе хуткае зацвярджэнне расійскім ВАК засведчыла прызнанне навуковых дасягненняў беларускай гісторыка-педагагічнай навукі і нашай навуковай школы, у стварэнне і ўмацаванне якой я ўнесла свой немалы ўклад. Гэта быў і асабісты ўнёсак у развіццё беларуска-расійскай інтэграцыі ў галіне педагагічнай навукі і адукацыі. Так я стала двойчы доктарам навук і першай жанчынай у Беларусі, якая носіць гэтыя дзве вышэйшыя навуковыя ступені, выдадзеныя дзвюма дзяржавамі (Беларуссю і Расіяй).

У 2013-м годзе я вярнулася ў родныя пенаты, да сваёй альма-матэр – у Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, дзе працягнула перапыненую працу. I ўжо больш за 10 гадоў з’яўляюся прафесарам кафедры культуралогіі факультэта сацыякультурных камунікацый БДУ. Культуралагічная навука і тыя дысцыпліны, якія выкладаю, дазваляюць шырока выкарыстоўваць веды, уменні і кампетэнцыі, напрацаваныя падчас атрымання базавай адукацыі па рускай філалогіі, навучання ў аспірантуры і дактарантуры па гістарычнай і педагагічнай навуках. У гэтае дзесяцігоддзе працягваліся і развіваліся даследаванні па гісторыі педагогікі, асветы і адукацыі на тэрыторыі Беларусі ў шырокіх гістарычных рамках: ад старажытнасці да сучаснасці. Паглыблялася распрацоўка тэмы аб «педагагічных хадаках» праз межы еўрапейскіх дзяржаў, узаемаўплывах беларускай, расійскай, польскай і ўкраінскай педагагічнай думкі. Уводзіліся новыя метадалагічныя падыходы і канцэпцыі да вывучэння гісторыка-педагагічнага і гісторыка-культурнага працэсу на прыкладзе Беларусі і іншых краін Усходняй

Еўропы. Падсумаваннем навуковай і педагагічнай дзейнасці стала манаграфія «Пераемнасць і наватарства ў святле адукацыі і культуры», прысвечаная 40-годдзю маёй навукова-педагагічнай дзейнасці (2020).

Вельмі важнай падзеяй у сваёй навуковай і акадэмічнаё дзейнасці лічу вылучэнне вучоным саветам БДУ кандыдатам у члены-карэспандэнты НАН Беларусі па спецыяльнасці «педагогіка» і добрыя вынікі – 13 галасоў акадэмікаў і член-карэспандэнтаў з 14 неабходных, лепшыя вынікі галасавання на выбарах у Аддзяленні гуманітарных навук і мастацтваў (2017 г.). Гэта адлюстравала высокае прызнанне акадэмічнай супольнасцю Беларусі нашых творчых, навуковых дасягненняў і здабыткаў беларускай школы гісторыка-педагагічных даследаванняў. На жаль, і да сённяшняга часу спецыяльнасць «педагогіка» застаецца не прадстаўленай сярод персанальнага складу членаў-карэспандэнтаў і акадэмікаў НАН Беларусі.

У прадстаўленай у кнізе перыядызацыі навукова-педагагічнай дзейнасці ў кантэксце педагагічных, гістарычных і культуралагічных даследаванняў выдзяляецца апошні этап, які пачаўся ў 2018 г. Ён характарызуецца новымі, больш складанымі ўмовамі жыццядзейнасці, звязанымі з пандэміяй каранавіруса, якім перахварэла ўся мая сям’я, турбулентнасцю сацыяльна-культурных і знешнепалітычных працэсаў, у якія аказалася ўцягнутая наша краіна. Некалькі гадоў універсітэцкія выкладчыкі працавалі ў новым фармаце дыстанцыйнага навучання, што запатрабавала авалодання інфармацыйнымі тэхналогіямі і карыстання імі, не выходзячы з дому.

Даследчыцкая і выкладчыцкая праца як кіраўніка тэмы па культурнай бяспецы Рэспублікі Беларусь у рамках дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў увянчалася выданнем калектыўнай манаграфіі пад маёй рэдакцыяй (2023). З ёю адкрываецца новая старонка ў даследаванні і асэнсаванні феномена культурнай бяспекі як важнейшага чынніка захавання нацыянальнай ідэнтычнасці беларускага народа. У гэтыя часы я таксама праводзіла далейшыя даследаванні ў галіне гістарычных і сучасных праблем адукацыі і педагагічнай думкі. Актуальная праблематыка канцэнтравалася на вывучэнні палікультурнай адукацыі і навацый ў сістэме ўніверсітэтазнаўства. Развіваліся творчыя сувязі з расійскімі калегамі, пашыралася свая навуковая школа праз падрыхтоўку кандыдатаў і дактароў навук. У апошнія гады яна папоўнілася кітайскімі даследчыкамі.

Падрыхтоўка нашага раздзела «Развитие экокультурного туризма в Беларуси: традиции и новации» увянчалася ўдзелам у калектыўнай расійска-беларускай манаграфіі «Стратегические направления развития индустрии туризма на сельских территориях» выдадзенай у Валгаградзе ў 2024 г. У манаграфіі прадстаўлена канцэпцыя фарміравання турыстычных кластараў і бізнес-экасістэм у сферы турызму, а таксама перспектывы развіцця турыстычнай сферы ў рэгіёнах Расіі і Беларусі.

Больш падрабязна з этапамі і падзеямі майго педагагічнага і навуковага шляху можна пазнаёміцца ў першым раздзеле выдання. Яны прадстаўлены як з уласнага, аўтабіяграфічнага, так і знешняга, біяграфічнага пункту гледжання. Бібліяграфічны раздзел змяшчае спіс навуковых прац за 1989–2024 гг. і пералік ста галоўных публікацый, інфармацыю пра сваю навуковую школу, літаратуру аб юбіляры.

У працы над паказальнікам мне дапамагалі муж, прафесар БДУ Уладзімір Еўдакімавіч Снапкоўскі, і мае сыны, Сяргей і Віктар. Кожны з іх унёс сваю лепту ў скарбонку летапісу майго творчага жыцця, якое было неаддзяліма ад гісторыі нашай сям'і, БДУ, іншых адукацыйных і навуковых устаноў у Беларусі, а таксама за мяжой, дзе давялося распаўсюджваць светач беларускай гуманітарыстыкі.

# АЎТАБІЯГРАФІЧНАЯ І БІЯГРАФІЧНАЯ ІНФАРМАЦЫЯ

## Асноўныя даты жыцця і творчасці

**1954** – нарадзілася 20 лістапада ў Мінску. Бацька Валянцін Сямёнавіч (1927–1994) – афіцэр, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, працаваў інжынерам-тэхнолагам на мінскіх прамысловых прадпрыемствах і ў сферы адукацыі, вынаходнік-рацыяналізатар. Маці Навіцкая Марыя Афанасьеўна (1926–2013) працавала ў сістэме Міністэрства гандлю ў Мінску.

**1973** – пасля паспяховага заканчэння сярэдняй і музычнай школ г. Мінска – паступленне на філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

**1978** – скончыла філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта і атрымала кваліфікацыю філолага, настаўніка рускай мовы і літаратуры.

**1978–1980** – на вызвольнай камсамольскай працы.

**1980–1989** – выкладчык рускай мовы падрыхтоўчага факультэта для замежных грамадзян БДУ.

**1980** – 10 кастрычніка выйшла замуж за Снапкоўскага Уладзіміра Еўдакімавіча (на той час маладога кандыдата гістарычных навук, навуковага супрацоўніка Інстытута гісторыі АН БССР).

**1982** – 12 красавіка нараджэнне сына Віктара.

**1989–1991** вучоба ў вочнай аспірантуры БДУ на кафедры педагогікі па спецыяльнасці «Тэорыя і гісторыя педагогікі», якую скончыла датэрмінова з прадстаўленнем дысертацыі да абароны.

**1991 (май)** – абараніла ў Беларускім навукова-даследчым інстытуце адукацыі Мінстэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь дысертацыю на суісканне вучонай ступені кандыдата педагагічных навук па тэме «Общественно-педагогическое движение и педагогическая мысль в Белоруссии (90-е годы XIX в. –1917 г.)» (спецыяльнасць 13.00.01 «тэорыя і гісторыя педагогікі»).

**1992–1997** – старшы выкладчык, дацэнт кафедры педагогікі БДУ.

**1991–2001** – загадчык лабараторыі гісторыі адукацыі і этнапедагогікі Нацыянальнага ін-та адукацыі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь (па сумяшчальніцтву).

**1994 (чэрвень)** – прысваенне ВАК Рэспублікі Беларусь вучонага звання дацэнта па спецыяльнасці «Тэорыя і гісторыя педагогікі».

**1995** – 24 красавіка – нараджэнне сына Сяргея.

**1995** – Выхад у свет у выдавецтве «Народная асвета» першай манаграфіі «Ля вытокаў нацыянальнай педагогікі: З гісторыі школы і педагагічнай думкі Беларусі канца XIX – пачатку XX ст.»

**1997–2000** – загадчык кафедры педагогікі і псіхалогіі Беларускага дзяржаўнага інстытута ўдасканалення ўрачоў (у 2000–2023 гг. Беларуская медыцынская акадэмія паслядыпломнай адукацыі, з 1 кастрычніка 2023 г. – Інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў аховы здароўя ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт»).

**1998–1999** – дактарант аддзела гісторыі Беларусі канца XYIII –пачатку XX ст. Інстытута гісторыі НАН Беларусі.

**1998** – публікацыя манаграфіі «Адукацыйная палітыка і школа на Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст.».

**1999 (кастрычнік)** – абарона ў Інстытуце гісторыі НАН Беларусі дысертацыі на суісканне вучонай ступені доктара гістарычных навук па тэме «Адукацыйная палітыка царызму і педагагічная думка ў Беларусі (60-я гады XIX ст. –1917 г.)» (спецыяльнасць 07.00.02 «айчынная гісторыя»).

**2001** – публікацыя вучэбнага дапаможніка «Гісторыя адукацыі і педагагічнай думкі Беларусі (60-я гады XIX – пачатак XX ст.)».

**2002 (красавік)** – прысваенне ВАК Рэспублікі Беларусь вучонага звання прафесара па спецыяльнасці «Педагогіка».

**2003–2005** – саветнік рэктара БДУ В. І. Стражава.

**2005–2010** – загадчык кафедры тэорыі і гісторыі культуры БДПУ імя Максіма Танка.

**2006** – выхад у свет вучэбнага дапаможніка «Гісторыя адукацыі і педагагічнай навукі».

**2008** – выданне вучэбнага дапаможніка «Культурология» (калектыў аўтараў пад рэдакцыяй С. В. Снапкоўскай).

**2010–2013** – намеснік старшыні па пытаннях культуры, педагогікі і адукацыі Федэральнай нацыянальна-культурнай аўтаноміі (ФНКА) «Беларусы Расіі» (Масква).

**2011** – публікацыя манаграфіі «Развитие образования и педагогической мысли на территории Беларуси во второй половине XIX – начале XX в.» (Масква).

**2010–2012** – стажыроўка ў Інстытуце гісторыі і тэорыі педагогікі Расійскай акадэміі адукацыі для завяршэння падрыхтоўкі доктарскай дысертацыі.

**2012 (верасень)** – абарона доктарскай дысертацыі «Развитие образования и педагогической мысли Беларуси: 60-гг. XIX – начало XX вв.» па спецыяльнасці «Тэорыя і гісторыя педагогікі» (педагагічныя навукі).

У 2013 г. атрыманы дыплом доктара педагагічных навук, выдадзены ВАК Расійскай Федэрацыі.

**2013 (верасень)** – прафесар кафедры культуралогіі факультэта сацыякультурных камунікацый БДУ.

**2017** – выданне вучэбнага дапаможніка «Культуралагічная думка Беларусі».

**2017 (верасень)** – вылучэнне Вучоным саветам БДУ кандыдатуры С. В. Снапкоўскай для ўдзелу ў выбарах у члены-карэспандэнты НАН Беларусі па спецыяльнасці «Педагогіка». На выбарах у Аддзяленні гуманітарных навук і мастацтваў, што адбыліся 2 лістапада, не хапіла аднаго голаса для намінацыі ў якасці кандыдата ў члены-карэспандэнты НАН Беларусі. Вынікі галасавання сталі дэманстрацыяй дасягненняў двойчы доктара навук (гістарычных і педагагічных) у галіне перш за ўсё педагогікі, а таксама айчыннай гісторыі і культуралогіі. Яны засведчылі, па фармальных і нефармальных прыкметах, прызнанне вышэйшым навуковым форумам Беларусі прафесара С. В. Снапкоўскай як вядучага прадстаўніка гісторыка-педагагічнай навукі краіны.

**2018 (студзень)** – узнагароджанне нагрудным знакам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь «Выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь».

**2019 (кастрычнік)** – прысваенне ганаровага звання «Заслужаны работнік БДУ».

**2020** – публікацыя манаграфіі «Пераемнасць і наватарства ў святле адукацыі і культуры».

**2020** – 10 кастрычніка – 40-годдзе шлюбу з Уладзімірам Снапкоўскім (Рубінавае вяселле) адзначылі ў стане захворвання каранавірусам, якім перахварэлі разам з сынамі Віктарам і Сяргеем.

**2021–2025** – кіраўнік навукова-даследчай працы «Культурная безопасность как приоритет гуманитарной безопасности Республики Беларусь» падпраграмы «Философия» Дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў «Грамадства і гуманітарная бяспека беларускай дзяржавы» на 2021–2025 гады.

**2023** – публікацыя калектыўнай манаграфіі пад рэдакцыяй С. В. Снапкоўскай «Культурная безопасность: исторические и теоретико-методологические основы».

**Вучэбнаяі навуковая дзейнасць за 2023 год** – вучэбная нагрузка склала 795 гадзін. Кіраўніцтва трыма дыпломнымі, адной магістарскай і 14 курсавымі работамі. Апублікавана 11 навуковых прац: адна манаграфія і 10 навуковых артыкулаў. Чатыры артыкулы ў ВАКаўскіх выданнях і да іх прыраўненых (за мяжой). Тры артыкулы індэксаваны ў базе даддзеных Скопус. Навуковы рэдактар адной манаграфіі і зборніка матэрыялаў навуковай канферэнцыі. Удзельнік трох міжнародных навуковых канферэнцый. Навуковы кіраўнік дзвюх кітайскіх аспірантак. Падрыхтавана і абмеркавана на кафедры культурологіі ФСК БДУ кандыдацкая дысер-

тацыя Чжэн Чао «Тенденции развития художественной культуры Китая в условиях реализации концепции «Один пояс, один путь». Кіравала навуковай працай студэнтаў і магістрантаў. Праводзіла заняткі па курсах «Культуралогія» і «Этнакультуралогія», а таксама мастацка-творчы практыкум. Прайшла павышэнне кваліфікацыі ў Рэспубліканскім інстытуце вышэйшай школы па праграме «Образовательный процесс в условиях модернизации системы высшего образования».

З'яўлялася членам Экспертнага савета па сацыяльна-эканамічным і духоўна-культурным развіцці Рэспублікі Беларусь пры Міністэрстве адукацыі, членам рабочай групы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь па мадэрнізацыі дысцыплін сацыяльна-гуманітарнага цыкла, членам савета факультэта сацыякультурных камунікацый БДУ, членам Навуковага савета па праблемах гісторыі адукацыі і педагагічнай навукі Расійскай акадэміі адукацыі.

Член рэдакцыйных саветаў часопісаў (грыф ВАК РФ) «Самарскі дзяржаўны ўніверсітэт», «Гісторыка-педагагічны часопіс», член рэдкалегіі беларускіх часопісаў (грыф ВАК РБ) «Веснік МГІРА», «Веснік Акадэміі грамадзянскай авіяцыі», «Працы БДТУ. Серыя 6. Гісторыя, філасофія», навуковага часопіса Польшчы (г. Радам), «Zeszyty Radomskie».

**2024** – Індэкс Хірша ў Гугл Схолар –8; і10-индекс –7.

## Этапы навуковай дзейнасці ў кантэксце педагагічных, гістарычных і культуралагічных даследаванняў

Першапачаткова сфера маіх навуковых інтарэсаў датычылася гісторыі адукацыі, педагогікі і педагагічнай думкі Беларусі другой паловы XIX – пачатку XX ст. Па гэтай тэматыцы была абаронена кандыдацкая дысертацыя, апублікаваны манаграфіі, вучэбныя дапаможнікі, бібліяграфічныя паказальнікі, энцыклапедычныя і іншыя навуковыя артыкулы (1990-я – пачатак 2000-х гг.).

У другой палове 1990-х гг. адбыўся вымушаны знешнімі абставінамі паварот ад гісторыка-педагагічных да ўласна гістарычных даследаванняў па тэме «Школа, асвета, адукацыйная палітыка царскага ўрада і грамадска-педагагічная думка на тэрыторыі беларускіх губерняў Паўночна-Заходняга краю ў канцы XIX – пачатку XX ст.». Змена тэматыкі была інстытуцыянальна афармлена дактарантурай у Інстытуце гісторыі НАН Беларусі з навуковым кансультантам доктарам гістарычных навук, прафесарам М. В. Бічом. Па спецыяльнасці «Айчынная гісторыя» апублікаваны шэраг артыкулаў і манаграфія «Адукацыйная палітыка і школа на Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст.».

Кніга, цыкл артыкулаў і затым доктарская дысертацыя выкананы на стыку некалькіх гуманітарных навук: гістарычнай, педагагічнай, культуралагічнай. *Гісторыя Беларусі* прадстаўлена матэрыяламі і падыходамі, якія адлюстроўваюць гістарычныя заканамернасці і канкрэтныя асаблівасці развіцця сістэмы адукацыі і ўрадавай школьнай палітыкі ў беларускіх губернях. *Гісторыя адукацыі і педагагічнай думкі* праходзіць праз факталогію і метадалогію глаў і раздзелаў, прысвечаных стану школьнай справы, вучэбна-метадычным і рэгіянальным асаблівасцям развіцця асветы, грамадска-педагагічнаму руху і педагагічнай думцы на тэрыторыі «Паўночна-Заходняга краю». *Культуралагічны зрэз працы* бачны ў тэарэтычных абагульненнях тэндэнцый развіцця культуры беларускага народа і фарміравання беларускай нацыі, даследаванні этнакультурных асаблівасцей развіцця асветы і грамадскай думкі ў беларускіх губернях Расійскай імперыі.

Абарона доктарскай дысертацыі адбылася ў час працы на пасадзе загадчыцы кафедры педагогікі і псіхалогіі Беларускага дзяржаўнага інстытута ўдасканалення ўрачоў (у далейшым – БелМАПА). У сваёй навукова-арганізацыйнай і вучэбна-метадычнай дзейнасці па стварэнню і кіраванню кафедрай я выкарыстоўвала ўласны навуковы і выкладчыцкі вопыт, набыты пры вывучэнні гісторыі асветы, адукацыйнай палітыкі і педагагічнай думкі Беларусі. Гэты вопыт спатрэбіўся і далей, калі працавала загадчыцай кафедры тэорыі і гісторыі культуры БДПУ імя Максіма Танка.

Храналагічна культуралагічнымі даследаваннямі давялося заняцца пазней за педагагічныя і гістарычныя. Але атрыманая вышэйшая адукацыя па філалогіі значна аблегчыла засваенне ведаў па гісторыі і тэорыі культуры, асабліва Беларусі. Да гэтага падштурхоўвала і пасада загадчыцы кафедры тэорыі і гісторыі культуры БДПУ імя Максіма Танка. Назапашаны патэнцыял ведаў і арганізацыйнага вопыту працы ў сферах гістарычных і педагагічных даследаванняў дазваляў і спрыяў новым дасягненням у галіне культуралогіі. Асэнсаванне і абагульненне назапашанага навукова-тэарэтычнага і практычнага вопыту ў кантэксце гісторыі і культуры Беларусі знайшло выраз у выданні навучальнага дапаможніка для студэнтаў ВНУ «Асновы культуралогіі» (2008 г.).

Вяртаючыся да сваёй галоўнай галіны ведаў (гісторыі адукацыі і педагогікі), адзначу, што да яе прыйшла падчас падрыхтоўкі ў БДУ кандыдацкай дысертацыі ў 1989–1991 гг. З тых часоў мае навуковыя інтарэсы былі звязаны з даследаваннямі гісторыі асветы, адукацыі і педагагічнай навукі Беларусі XIX – пачатку XX ст., але храналагічны і тэматычны дыяпазон навуковых распрацовак у шэрагу іншых выпадкаў даволі значна пашыраўся – ад X да пачатку XXI ст.

Вынікі нашых даследаванняў у галіне гісторыі адукацыі, асветы, педагагічнай думкі, адукацыйнай палітыкі часоў Расійскай імперыі і СССР,

тэорыі і гісторыі культуры Беларусі, якія праводзіліся ў рэчышчы педагагічнай, гістарычнай і культуралагічнай навук, можна прадставіць ў выглядзе чатырох этапаў.

**I этап (1990-я гг.)** уключае пошук, выяўленне, даследаванне і сістэматызацыю архіўных дакументаў, матэрыялаў і літаратуры, што было увасоблена ў публікацыі артыкулаў і абароне кандыдацкай дысертацыі ў 1991 г. У гэты час аўтарам было распрацавана гісторыка-педагагічнае абгрунтаванне канцэпцыі нацыянальнай беларускай школы і раскрыта этнакультурная спецыфіка нацыянальнай адукацыі і выхавання, што знайшло адлюстраванне ў манаграфіі «Ля вытокаў нацыянальнай педагогікі» (1995 г.). Пазней у выніку працы на пасадзе загадчыцы лабараторыі гісторыі адукацыі і этнапедагогікі Нацыянальнага інстытута адукацыі быў створаны банк дадзеных ў выглядзе публікацыі навукова-даведачнага выдання «Асвета і педагагічная думка ў Беларусі: Са старажытных часоў да пачатку XX ст. Бібліяграфічны паказальнік» (У 2 ч.) і «Асвета і педагагічная думка на Беларусі. Бібліяграфічны паказальнік. Ч. III: 1917–1945 гг.». У выданні ўпершыню прадстаўлена шырокае кола крыніц па гісторыі асветы і педагагічнай думцы Беларусі ад старажытнасці да 1945 г. (разам – 8347 крыніц), у тым ліку працы аўтараў, рэпрэсіраваных у 1930-я гг, дакументы і матэрыялы аб дзейнасці беларускіх школ за межамі Беларусі, персаналіі педагогаў і асветнікаў, педагагічная журналістыка, вучэбна-метадычная літаратура і інш. Навуковая навізна выдання заключалася таксама ў наяўнасці кароткіх каментарыяў (анатацый) да архіўных крыніц, выяўленых з архіваў Расіі, Беларусі і Літвы.

У 1995 г. аўтарам прадстаўлены артыкул пра гісторыка-педагагічныя даследаванні ў Беларусі для Міжнароднага даведніка па даследаваннях у галіне гісторыі адукацыі, які выдаецца Міжнароднай пастаяннай канферэнцыяй па гісторыі адукацыі ў Берне (Швейцарыя). Абагульняючы артыкул пра замежныя педагагічныя ўплывы і «пагранічныя пераходы» ў Беларусі ад сярэднявечча да 1917 г. апублікаваны ў томе «Педагагічныя хадакі праз граніцы ў Еўропе», што выйшаў у серыі «Гісторыя адукацыі і еўрапейская ідэнтычнасць». Серыя выдавалася ў Аўстрыі і Германіі.

У манаграфіі «Адукацыйная палітыка і школа на Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст.» (1998 г.) ажыццёўлена даследаванне асаблівасцей (гісторыка-культурных, сацыяльна-палітычных, этнічных, моўных, канфесійных) як важнейшых базісных элементаў развіцця асветы і педагагічнай думкі Беларусі ўказанага перыяду. Аўтарам прааналізаваны асноўныя напрамкі і фактары развіцця адукацыі і педагагічнай думкі Беларусі на рубяжы стагоддзяў і падкрэслена вядучая роля адукацыйнай, культурна-асветніцкай палітыкі расійскага ўрада ў комплексе мерапрыемстваў па інтэграцыі тэрыторыі Паўночна-Заходняга краю ў склад

імперыі. Манаграфія стала падставай доктарскай дысертацыі, абароненай у Інстытуце гісторыі НАН Беларусі ў 1999 г. па гістарычных навуках (спецыяльнасць «Айчынная гісторыя»).

У калектыўнай манаграфіі «Народная педагогіка беларусаў» (адк. рэдактар і сааўтар С. В. Снапкоўская, 1996 г.) паказана месца народнай педагогікі ў сістэме этнічнай культуры, дзейнасць і педагагічныя погляды беларускіх вучоных-этнографаў у другой палове XIX – пачатку XX ст., раскрыта этнапедагогіка сельскага насельніцтва Беларусі. У аналітычных брашурах і матэрыялах аб асноўных тэндэнцыях развіцця школы на тэрыторыі Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст. і шляхах рэфармавання сярэдняй школы ў СССР і БССР ў сярэдзіне 50-х –пачатку 60-х гадоў XX ст. раскрыты перадумовы, механізмы і наступствы рэалізацыі шэрагу школьных рэформаў, што дазволіла выявіць логіку трансфармацыйных працэсаў у сістэме сучаснай адукацыі. Гэтыя выданні былі выкарыстаны ў 1997 г. падчас парламенцкіх слуханняў па праблемах рэфармавання школы ў Палаце прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

На працягу **II этапу (2000–2009 гг.)** гісторыка-педагагічных даследаванняў ажыццяўлялася ўкараненне вынікаў навуковых даследаванняў у адукацыйны працэс сістэмы паслядыпломнай адукацыі і педагагічных ВНУ Рэспублікі Беларусь праз выданне вучэбна-метадычных дапаможнікаў «Гісторыя адукацыі і педагагічнай думкі Беларусі (60-я гады XIX – пачатак XX ст.)» (2001 г.), «Гісторыя адукацыі і педагагічнай навукі» (2006 г.). Асэнсаванне і абагульненне назапашанага навукова-тэарэтычнага і практычнага вопыту ў кантэксце гісторыі і культуры Беларусі знайшло выраз у выданні навучальнага дапаможніка для студэнтаў ВНУ «Асновы культуралогіі» (2008 г.). Правядзенне навуковых даследаванняў і выкладчыцкая праца на пасадах загадчыка кафедры педагогікі і псіхалогіі Беларускага дзяржаўнага інстытута ўдасканалення ўрачоў, загадчыцы кафедры БДПУ імя Максіма Танка спалучаліся з працай у спецыялізаваным савеце па абароне доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый па педагагічных навуках пры БДПУ і экспертным савеце ВАК Рэспублікі Беларусі па педагогіцы і псіхалогіі.

Апублікаваны цыкл артыкулаў па гісторыі педагагічнай адукацыі і педагагічнай думкі Беларусі, жаночай адукацыі, этнакультурнай дынамікі рэгіёнаў Беларусі ў сістэме асветы Расійскай імперыі (канец XIX – пачатак XX ст.). Артыкулы па адукацыі, асвеце, выхаванні выйшлі ў энцыклапедычных выданнях «Беларуская энцыклапедыя» і «Культура Беларусі». На гэты час прыпадае публікацыя артыкулаў у польскіх перыядычных выданнях па праблемах нацыянальных каштоўнасцей і самасвядомасці ў адукацыі і педагогіцы Беларусі і Расіі, гуманізацыі адукацыі, ролі мовы, рэлігіі і культуры ў развіцці адукацыі ў беларускіх губернях Расійскай імперыі.

На **III этапе (2010–2017 гг.)** прафісійная дзейнасць была звязана з працай намесніка выканаўчага дырэктара, намесніка старшыні па пытаннях культуры, педагогікі і адукацыі Федэральнай нацыянальна-культурнай аўтаноміі (ФНКА) «Беларусы Расіі» ў Маскве. У гэты ж час прайшла стажыроўку ў Інстытуце гісторыі і тэорыі педагогікі Расійскай акадэміі адукацыі для падрыхтоўкі доктарскай дысертацыі. У 2012 г. абараніла ў Ніжэгародскім дзяржаўным архітэктурна-будаўнічым універсітэце доктарскую дысертацыю «Развитие образования и педагогической мысли Беларуси: 60-гг. XIX – начало XX в.» па спецыяльнасці «Тэорыя і гісторыя педагогікі» (педагагічныя навукі). З 2013 г. пачынаецца новы этап у прафісійнай кар'ере: вяртанне ў родны ўніверсітэт і праца прафесарам кафедры культуралогіі факультэта сацыякультурных камунікацый БДУ.

Распрацавана рэтраспектыўная фреймавая мадэль адукацыі, накіраваная на гарманізацыю нацыянальнага і ўніверсальнага кампанентаў у гісторыка-культурным кантэксце. На аснове аналізу гісторыка-педагагічых матэрыялаў, статыстыкі, навуковай і перыядычнай літаратуры (беларускага і агульнарасійскага зместу) перыяду позneімперскай Расіі абгрунтавана неабходнасць спалучэння ў гісторыка-педагагічным даследаванні трох метадалагічных парадыгмаў: правінцыйнай, агульнарасійскай і рэгіянальнай. Аўтарскія падыходы, пабудаваныя на нацыянальнай канцэпцыі гісторыі Беларусі і асэнсаваныя з улікам развіцця расійскай гісторыка-педагагічнай навукі, адлюстраваны ў манаграфіі «Развитие образования и педагогической мысли на территории Беларуси во второй половине XIX – начале XX в.» (Москва, 2011 г.). Яны ж атрымалі навуковую апрабацыю і верыфікацыю сярод вядучых спецыялістаў Расіі падчас паспяховай абароны доктарскай дысертацыі.

Усталявала і развівала творчыя сувязі і адукацыйна-навуковае супрацоўніцтва з польскімі вучонымі і акадэмічнымі выкладчыкамі. Удзельнічала ў міжнародных навуковых канферэнцыях, якія праводзіліся ў Беларусі, Расіі і Польшчы. Выступала з дакладамі і паведамленнямі, праводзіла лекцыйныя і семінарскія заняткі са студэнтамі. У шэрагу артыкулаў, змешчаных у польскіх навуковых выданнях, прааналізавана праблематыка, звязаная з нацыянальнымі каштоўнасцямі і нацыянальнай свядомасцю ў беларускай і расійскай педагагічнай думцы.

Намі ўпершыню абгрунтаваны новы навуковы напрамак у гісторыка-педагагічных даследаваннях – праблема беларуска-расійскага культурна-педагагічнага памежжа, апрабіраванне якога адбылося ў рамках міжнародных Ліхачоўскіх чытанняў (Санкт-Пецярбург), таксама на сесіях Навуковага савета па гісторыі адукацыі і педагагічнай навукі Інстытута тэорыі і гісторыі педагогікі Расійскай акадэміі адукацыі і ў педагагічным друку Беларусі, Расіі і Польшчы. Абгрунтаваны гістарычны фенамен беларуска-расійскага культурна-педагагічнага памежжа, як і праблема

фарміравання і захавання нацыянальнай ідэнтычнасці праз тэарэтычную распрацоўку і практычнае ўкараненне сістэмы маральных каштоўнасцей у культурна-адукацыйны працэс у рамках навуковага праекта Інстытута сусветнай эканомікі і міжнародных адносін РАН.

Праца на кафедры культуралогіі ФСК БДУ падштурхнула маё вяртанне да культуралагічнай навукі, больш глыбокага асэнсавання тэорыі і гісторыі культуры Беларусі. На падставе аксіялагічнага падыходу тэарэтычна абгрунтаваны і раскрыты асноўныя дамінанты беларускай культуры, вызначаны ключавыя этапы і асаблівасці развіцця беларускай культуралагічнай думкі Беларусі. На аснове аксіялагічнага падыходу разам са сваім вучнем К. У. Антановічам стварыла тэарэтычнае абгрунтаванне і распрацавала метадычнае забеспячэнне і арыгінальную аўтарскую методыку ўкаранення сістэмы маральных каштоўнасцей у сучасны культурна-адукацыйны працэс праз вучэбны дапаможнік «Культуралагічная думка Беларусі» (з грыфам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, 2017 г.).

У вучэбным дапаможніку, серыі артыкулаў і пазнейшай манаграфіі аб пераемнасці і наватарстве распрацаваны шляхі ўвядзення маральных каштоўнасцей у сучасны адукацыйны працэс: 1) *музейна-педагагічны* – сукупнасць навукова-асветніцкіх мерапрыемстваў, арыентаваных на сацыялізацыю асобы на аснове сінтэзу сістэмы маральных каштоўнасцей і сучасных музейных тэхналогій; 2) *культурна-адукацыйны* – сістэма адукацыйна-выхаваўчых і культурна-асветніцкіх мер, скіраваная на фарміраванне і развіццё творчай асобы праз арыентацыю навучальнага працэсу на каштоўнасці нацыянальнай культуры і іх актуалізацыю; 3) *інфармацыйна-асветніцкі* – сістэмная праца, скіраваная на папулярызацыю і прапагандаванне здабыткаў нацыянальнай культуры сродкамі масавай інфармацыі, у тым ліку праз спецыялізаваныя выданні. Распрацавана адпаведная методыка ўкаранення сістэмы маральных каштоўнасцей у сучасны культурна-адукацыйны працэс. Адметная асаблівасць сучасных гісторыка-педагагічных даследаванняў: наяўнасць выразнай сувязі гісторыі і сучаснасці праз працэс актыўнай інтэграцыі з даследаваннямі ў галіне культуралогіі (этнакультуралогіі, тэорыі і гісторыі культуры), скіраванымі на ўмацаванне этнакультурнай ідэнтычнасці беларусаў.

Падсумаваннем усёй папярэдняй навукова-педагагічнай дзейнасці стаў удзел у выбарах у члены-карэспандэнты НАН Беларусі па спецыяльнасці «Педагогіка» у 2017 г. Вылучэнне Вучоным саветам БДУ маёй кандыдатуры і высокія вынікі галасавання ў Аддзяленні гуманітарных навук і мастацтваў адлюстравалі шырокае прызнанне акадэмічнай супольнасцю Беларусі творчых дасягненняў прафесара, доктара педагагічных і доктара гістарычных навук С. В. Снапкоўскай як аднаго з вядучых прадстаўнікоў педагагічнай навукі ў нашай краіне.

На **IV этапе (2018–2024 гг.)** навукова-педагагічная і экспертная дзейнасць працягвалася ў якасці прафесара кафедры культуралогіі ФСК БДУ. Вынікі 40-гадовай працы як акадэмічнага выкладчыка і навуковага даследчыка падведзены ў абагульняючай манаграфіі «Пераемнасць і наватарства ў святле адукацыі і культуры» (Мінск, 2020). У выданні прадстаўлены тэарэтыка-метадалагічныя і канкрэтна-гістарычныя аспекты гісторыка-педагагічных і гісторыка-культурных даследаванняў аўтара, абгрунтаваны працэсы пераемнасці і наватарства як важнейшыя чыннікі развіцця адукацыі, навукі і культуры Беларусі. Асобны акцэнт у кнізе зроблены на падсумаванні аўтарскіх даследаванняў у галіне асветы, адукацыйнай палітыкі і педагагічнай думкі Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. Распрацаваныя мадэлі рэфармавання школьнай адукацыі на аснове нацыянальнага і ўніверсальнага кампанентаў могуць садзейнічаць развіццю дзяржаўнай палітыкі ў галіне асветы і культуры. Сучасныя напрамкі фарміравання і пашырэння беларуска-расійскага культурнага дыялогу, у якім аўтар прымаў і працягвае прымаць актыўны ўдзел як з беларускага, так і расійскага бакоў у Мінску і Маскве, служаць развіццю культурных, навуковых і адукацыйных адносін паміж двума народамі і дзяржавамі. На падставе выкладання шэрагу культуразнаўчых дысцыплін прапанаваны шляхі і сродкі крэатыўнай самарэалізацыі студэнтаў-культуролагаў у культурна-адукацыйным працэсе.

З 2021 г. з'яўляюся кіраўніком навукова-даследчай тэмы «Культурная бяспека як прыярытэт гуманітарнай бяспекі Рэспублікі Беларусь» падпраграмы «Філасофія» Дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў «Грамадства і гуманітарная бяспека беларускай дзяржавы» на 2021–2025 гг. Галоўным вынікам выканання тэмы стала публікацыя калектыўнай манаграфіі «Культурная безопасность: исторические и теоретико-методологические основы» (пад навуковай рэдакцыяй С. В. Снапкоўскай, 2023 г.). Асабісты ўклад – напісанне ўводзін, трох тэарэтычных глаў і заключэння.

У працы прааналізаваны гістарычныя і тэарэтыка-метадалагічныя асновы праблем культурнай бяспекі, паказаны асаблівасці даследаванняў гэтай праблематыкі з пункту гледжання сінтэза культурных традыцый і сучасных інавацый. Упершыню разгледжана паняцце культурнай бяспекі як важнага элемента нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь; раскрыта роля і значэнне культурнай бяспекі на сучасным этапе развіцця беларускага соцыума ў гісторыка-культурным і сацыяльна-палітычным аспектах. Раскрыты нарматыўна-прававыя аспекты забеспячэння культурнай бяспекі грамадства і дзяржавы, падкрэслена неабходнасць захавання і развіцця гісторыка-культурнай спадчыны беларускага народа.

Працягам вывучэння гэтай тэмы з'яўляліся публікацыі артыкулаў пра культурную бяспеку як важнага элемента захавання ідэнтычнасці ва ўмовах глабалізацыі, культурнае і педагагічнае памежжа Беларусі. Больш прыкладны характар мелі артыкулы пра фарміраванне полікультурнай

адукацыі і сацыякультурную адаптацыю мігрантаў у полікультурнай адукацыйнай прасторы, фарміраванне культурнага іміджу Беларусі ў сферы агратурызму. У кантэксце гісторыка-педагагічных даследаванняў вывучаўся ўклад прадстаўнікоў педагагічнай думкі Расіі і Беларусі другой паловы XIX ст. (на прыкладзе расійскага педагога-вучонага з беларускімі каранямі В. А. Валковіч) у стварэнне асноў нацыянальнай адукацыі. Даследаваліся этнакультурная ідэнтычнасць беларусаў дарэвалюцыйнага Санкт-Пецярбурга і праблемы адукацыі і выхавання ў педагагічным друку Беларусі 1920-х гг. Асобныя артыкулы апублікаваны ў Кітаі і Расіі з індэксацыяй ў Скопусе.

На гэтым этапе ўсталяваліся творчыя сувязі з рэгіянальнымі расійскімі ўніверсітэтамі (Валгаградскім дзяржаўным аграрным універсітэтам і Арлоўскім дзяржаўным універсітэтам), Бакінскім славянскім універсітэтам. Аўтар гэтых радкоў выступала з дакладамі і прывітальнымі словамі ад Беларусі на пленарных пасяджэннях міжнародных навуковых канферэнцый, арганізаваных гэтымі ўніверсітэтамі, апублікавала шэраг артыкулаў у іх навуковых выданнях.

Новай старонкай у прафісійнай дзейнасці стала падрыхтоўка кандыдатаў навук з ліку кітайскіх аспірантаў па спецыяльнасці «Культуралогія». Аспіранткай Чжэн Чао падрыхтавана кандыдацкая дысертацыя «Тенденции развития художественной культуры Китая в условиях реализации концепции “Один пояс, один путь”», рэкамендаваная да абароны. Другая аспірантка Лі Вэйвэй завяршыла напісанне кандыдацкай дысертацыі «Развитие китайско-белорусских межкультурных коммуникаций в XXI в.».

Навукова-арганізацыйная і экспертная праца ажыццяўлялася ў рамках Вучонага савета БДУ і савета ФСК, Экспертнага савета па сацыяльна-эканамічным і духоўна-культурным развіцці Рэспублікі Беларусь пры Міністэрстве адукацыі, Рабочай групы Міністэрства адукацыі па мадэрнізацыі дысцыплін сацыяльна-гуманітарнага цыкла, Навуковага савета па праблемах гісторыі адукацыі і педагагічнай навукі Расійскай акадэміі адукацыі.

На гэты этап жыцця і прафесійнай дзейнасці прыпадае узнагароджанне нагрудным знакам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь «Выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь» і прысваенне ганаровага звання «Заслужаны работнік БДУ».

## Пра пераемнасць: традыцыі і наватарства ў гісторыка-педагагічных даследаваннях у БДУ і Беларусі

У развіцці педагагічнай навукі відавочна аксіаматычная сувязь пераемнасці і наватарства, але ў кожны гістарычны перыяд можна назіраць прэваліраванне аднаго працэсу над іншым. Разгледзім пераемнасць і наватарства ў развіцці асноўных кірункаў айчынных педагагічных ведаў з другой паловы XIX да пачатку XXI ст.

Аналіз крыніц і гісторыка-педагагічнай літаратуры паказвае, што ў канцы XIX – пачатку XX ст. працы беларускіх і расійскіх навукоўцаў адрозніваліся канцэптуальнай складанасцю і лагічнасцю, у іх прадстаўлены працэс эвалюцыі школы і педагагічнай думкі Беларусі на фоне развіцця беларускай, агульнарасійскай і сусветнай культуры. Аднак цэласнасць і шматпланавасць развіцця гісторыка-педагагічнага працэсу перарываецца ў выніку рэвалюцыйных падзей, змены грамадска-палітычнага ладу, а затым і дамінуючай парадыгмы адукацыі.

Панаванне монаідэалогіі ў грамадскіх навуках савецкага перыяду не давала магчымасці ацаніць пазітыўна ці хаця б усебакова погляды прадстаўнікоў розных традыцый і грамадскіх плыняў, асабліва дзейнасць педагогаў традыцыяналісцка настроенага праваслаўна-кансерватыўнага лагера. Іх дзейнасць і погляды прадстаўляліся варожымі і ацэньваліся негатыўна ў параўнанні з ідэямі прадстаўнікоў ліберальна-дэмакратычнага кірунку.

Стварэнне БССР і «беларусізацыя» 1920-х гадоў сталі працягам (хаця і ненадоўга) перарванай нацыянальна-культурнай традыцыі ў адукацыі і выхаванні, згуртаваўшы вакол Інбелкульта бліскучых навукоўцаў, прадстаўнікоў культуры, асветы, адукацыі і педагагічнай думкі Беларусі. Але ўжо ў 1930-я гады для пануючага рэвалюцыйнага падыходу ва ўсіх сферах грамадскіх навук і культуры само сцвярджэнне пераемнасці было ненатуральным, паколькі ў ідэі «стары парадак мы зруйнуем» заключалася яе адмаўленне. Рэпрэсіі выбітных дзеячоў нацыянальнай навукі, асветы і культуры на дзесяцігоддзі ліквідавалі пераемную сувязь паміж пакаленнямі беларусаў.

Пазнейшыя гісторыка-педагагічныя даследаванні абмежаваліся выбарам савецкага этапу развіцця школы і педагогікі. Тут разглядаліся толькі поспехі і дасягненні савецкай педагагічнай навукі, а працы былі прымеркаваны ў асноўным да юбілейных дат. Між іншым, працы 1980-х гг., падрыхтаваныя беларускімі навукоўцамі на роднай мове, адрозніваюцца фундаментальнасцю, грунтуюцца на шырокай палітры канцэпцый выхавання і адукацыі, фактаў, перадавым вопыце лепшых школ і настаўнікаў, ідэй вядомых айчынных навукоўцаў-педагогаў і грамадскіх дзеячаў, якія прысвяцілі сваё жыццё будаўніцтву новай школы.

Паколькі метадалагічнай асновай гэтых даследаванняў з’яўлялася марксісцка-ленінскае вучэнне аб выхаванні і адукацыі падрастаючага пакалення, фарміраванні камуністычнага светапогляду навучэнцаў, узаемаадносінах асобы і калектыву, адрозныя ад гэтай ідэалогіі канцэпцыі, погляды, ідэі падвяргаліся рэзкай крытыцы. Негатыўнае стаўленне да іншых меркаванняў і дарэвалюцыйнага мінулага абумоўлівала аднабаковы характар даследаванняў і не давала шматмернага цэласнага ўяўлення аб працэсе развіцця гісторыка-педагагічнай навукі.

Рэальную магчымасць выйсці на новы этап свайго развіцця атрымала гісторыка-педагагічная думка 1990-х гг., якая характарызуецца імкненнем да сістэмнай інтэграцыі навуковых ведаў ва ўмовах глыбокай трансфармацыі соцыўма. Узрасла цікавасць айчынных навукоўцаў да вывучэння эвалюцыі традыцый культуры і адукацыі Беларусі ў гісторыка-педагагічным працэсе XX ст. у яго цэласнасці і пераемнасці. Сапраўднае даследаванне працэсу эвалюцыі і развіцця ідэй пераемнасці і наватарства ў гісторыі педагагічнай навукі ажыццяўляецца з улікам сацыяльна-эканамічных, культурна-гістарычных і псіхолага-педагагічных перадумоў яе развіцця на канкрэтна-гістарычных этапах, з пазіцый сучаснай сацыякультурнай рэальнасці і перспектыў цывілізацыйнага развіцця беларускага грамадства. Папярэднія стагоддзі ў гісторыі адукацыі, як і ў цэлым у гісторыі чалавецтва, пакінулі вялікую спадчыну. Айчыннымі навукоўцамі-педагогамі, псіхолагамі, настаўнікамі была сфарміравана фундаментальная і ўнікальная педагогіка савецкай і постсавецкай, нацыянальнай беларускай школы, якая ў лепшых сваіх узорах мае міжнароднае значэнне.

Фарміраванне гісторыка-педагагічнай думкі і асноў навуковых ведаў пра гістарычныя этапы развіцця асветы, адукацыі і педагогікі на тэрыторыі Беларусі адбывалася ў канцы XIX – пачатку XX ст. У кантэксце нацыянальнага адраджэння і станаўлення беларускай нацыі ў педагагічнай думцы Беларусі сфарміраваўся нацыянальна-дэмакратычны кірунак. Яго галоўны змест складала праблема стварэння беларускай школы і адукацыі на роднай мове ў беларускіх губернях «Паўночна-Заходняга края». Гэтая праблема ставілася і абмяркоўвалася педагогамі, народнымі настаўнікамі, пісьменнікамі і паэтамі, публіцыстамі і крытыкамі, навукоўцамі і дзеячамі асветы на агульнарасійскіх і беларускіх настаўніцкіх і педагагічных з’ездах. Галоўнымі і найбольш яркімі прадстаўнікамі нацыянальна-дэмакратычнага кірунку ў педагагічнай думцы Беларусі былі М. Багдановіч, М. Гарэцкі, Я. Колас, Я. Купала, К. Каганец, В. Ластоўскі, А. і І. Луцкевічы, С. Палуян, Б. Тарашкевіч, А. Пашкевіч (Цётка) і інш.). Можа сказаць, што яны заклалі фундамент беларускай нацыянальнай школы, педагагічнай думкі і навукі.

У 1920-я гг. праблематыка гісторыі адукацыі, педагагічнай думкі і грамадска-педагагічнага руху Беларусі паслярэформеннага перыяду знайшла адлюстраванне ў фундаментальных працах вядомых расійскіх і беларускіх гісторыкаў і педагогаў В. М. Ігнатоўскага, М. У. Доўнар-Запольскага, А. І. Цвікевіча. Даследаванне Д. А. Сцяпуры «Стан народнай асветы ў Беларусі да вайны 1914 г.» (Мінск, 1926 г.) было першай спецыяльнай работай у савецкай Беларусі па гісторыі адукацыі. Вядомы гісторык, першы рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта У. І. Пічэта ў працы «Беларуская мова як фактар нацыянальна-культурны» (1924 г.)

даследаваў ролю беларускай мовы ў грамадскім, нацыянальна-культурным і педагагічным развіцці беларусаў.

Імклівае развіццё педагагічных ведаў прывяло да таго, што ў 1929 г. у Мінску ўпершыню на беларускай мове была выдадзена «Гісторыя педагогікі». Аўтарам падручніка для педагагічных факультэтаў ВНУ і педтэхнікумаў быў першы ў Беларускай ССР доктар педагагічных навук, прафесар П. Я. Панкевіч. Вучоны-педагог назапасіў матэрыял для кнігі, напісанай з класавых пазіцый ў адпаведнасці з пастулатамі бальшавіцкай ідэалогіі, яшчэ працуючы ў Акадэміі камуністычнага выхавання ў Маскве, затым – у якасці дацэнта і прафесара БДУ. Пасаду загадчыка Галоўнага ўпраўлення навукай Наркампраса БССР ён спалучаў з выкладчыцкай працай ў БДУ. П. Я. Панкевіч стаў адным са стваральнікаў і першым дырэктарам Навукова-даследчага інстытута педагогікі (зараз – Нацыянальнага інстытута адукацыі). Традыцыя спалучэння навукова-даследчай з выкладчыцкай працай у БДУ, пакладзеная гэтым і іншымі прафесарамі педагогікі ў 1920-я гг., не перарывалася некалькі дзесяцігоддзяў і давала добрыя вынікі. Пазней асабліва выразна гэта праявіцца ў фундаментальных гісторыка-педагагічных даследаваннях, дзе галоўным жанрам будзе выступаць калектыўная манаграфія.

У 1930–40-я гг. па ідэалагічных і палітычных прычынах гісторыка-педагагічная праблематыка ў Беларусі, як і на тэрыторыі іншых савецкіх рэспублік, фактычна не распрацоўвалася, саступіўшы месца марксісцка-ленінскай педагогіцы і напрамкам камуністычнага выхавання. Сітуацыя ў галіне гісторыі педагогікі як у БССР, так і ў цэлым у СССР, стала змяняцца пасля XX з'езда КПСС у час адлігі, калі быў адкрыты частковы доступ да раней забароненых архіўных дакументаў і матэрыялаў і, як следства, узмацнілася цікавасць да дадзенай праблематыкі, павысіўся навуковы ўзровень даследаванняў беларускіх гісторыкаў педагогікі.

У першай палове 1950-х гг. у Маскве абаронены першыя кандыдацкія дысертацыі па гісторыка-педагагічнай праблематыцы перыяду XIX і пачатку XX ст., якія адрозніваліся як класавай тэндэнцыйнасцю і метадычнай апісальнасцю, так і багаццем статыстычных звестак. Яны дэманстравалі недаступнасць адукацыі для простага народа, аднак, з другога боку, змяшчалі аналіз педагагічных поглядаў і дзейнасці «дазволеных» персаналій (М. К. Кірылаў, П. С. Івашчанка, І. А. Алісіевіч). У рабоце А. І. Краўцова «Педагагічная адукацыя ў Беларусі ў дакастрычніцкі перыяд» (Мінск, 1958) упершыню на аснове глыбокага і ўсебаковага аналізу крыніц былі выяўлены карані русіфікатарскай адукацыйнай, у тым ліку кадравай палітыкі ўрада ў беларускіх губернях, прааналізаваны асаблівасці стану і развіцця педагагічнай адукацыі ў Заходнім краі.

Спатрэбілася 30 гадоў, каб беларускі чытач убачыў гісторыка-педагагічныя працы на роднай мове. Так, двума выданнямі (1957 і 1961 гг.)

выходзіла манаграфія на беларускай мове І. М. Ільюшына, С. А. Умрэйкі «Народная асвета ў Беларускай ССР», дзе на 60 старонках з выкарыстаннем вельмі абмежаванай колькасці крыніц даваўся кароткі агляд гісторыі асветы і адукацыі на беларускіх землях з XI ст. да 1917 г.

Моцным каталізатарам развіцця гісторыка-педагагічных даследаванняў у Беларусі стала дзейнасць члена-карэспандэнта АПН СССР, прафесара С. А. Умрэйкі, які ўзначальваў кафедру педагогікі і псіхалогіі БДУ ў 1964–1972 гг. Яго намаганнямі ў 1968 г. у Мінску выйшла калектыўная манаграфія «Нарысы гісторыі народнай асветы і педагагічнай думкі ў Беларусі». Гэта фундаментальнае выданне на 620 старонках кансалідавала выдатных беларускіх педагогаў-даследчыкаў (С. А. Умрэйка, Г. Р. Сянькевіч, У. К. Андрэнка, П. С. Сонцаў і інш.), пад рэдакцыяй якіх была падрыхтаваная гэта праца. Тут упершыню значнае месца адведзена адукацыйным і педагагічным праблемам Беларусі дарэвалюцыйнага перыяду. У манаграфіі раскрыты педагагічная дзейнасць і погляды выбітных педагогаў-даследчыкаў і метадыстаў-практыкаў БССР, паказаны іх уплыў на развіццё беларускай навукі і педагагічнай думкі. Нягледзячы на працяг выкарыстання тэрміна «барацьба» (партыі бальшавікоў, РСДРП, прагрэсіўнай настаўніцкай грамадскасці, бацькоўскага руху за перадавую школу і г. д.) як неад'емнага атрыбуту гісторыка-педагагічных даследаванняў савецкага часу, змест абароненых дысертацый і публікацый гісторыкаў педагогікі высвятляецца ўжо новымі гранямі.

У даследаваннях 1960–70-х гг. робіцца акцэнт на вывучэнні творчай спадчыны персаналій педагагічнай думкі і педагагічнай журналістыкі Беларусі. Вакол вучонага-педагога С. А. Умрэйкі фарміруецца калектыў педагогаў – даследчыкаў БДУ, і плённа распрацоўваюцца разнастайныя аспекты гісторыі асветы, адукацыі і педагогікі Беларусі. У 1970-я гады выкладчыкамі БДУ абараняецца шэраг дысертацыйных даследаванняў па гісторыі педагогікі. С. В. Лузгіна раскрыла шляхі станаўлення і развіцця педагагічнага друку на Беларусі, прааналізаваўшы працэс фармавання савецкага педагагічнага друку ў 1919–1932 гг. У. Н. Радыёнаў даследаваў педагагічную спадчыну Якуба Коласа і паказаў яе значнасць для развіцця сучаснай педагагічнай навукі і школьнай методыкі. З. М. Ціток прааналізавала станаўленне і функцыянаванне савецкай школы Беларусі ў перыяд грамадзянскай вайны і ўзнаўлення народнай гаспадаркі ў 1917–1925 гг.

У 1980-я гг. па гісторыі адукацыі і педагогікі ў Беларусі абаронена толькі адна кандыдацкая дысертацыя – «Школа и педагогическая мысль в Белоруссии с 1895 г. до Великой Октябрьской социалистической революции», аўтарам якой быў выкладчык кафедры педагогікі БДУ М. С. Мяцельскі. Ён прааналізаваў развіцце агульнай і прафесійнай адукацыі, дзейнасць земстваў у арганізацыі пачатковай школы і бацькоўскіх камітэтаў на тэрыторыі Віленскай навучальнай акругі.

Беларуская гісторыка-педагагічная тэматыка знаходзіла сваё адлюстраванне адначасова і ў агульнасаюзных выданнях. Абагульняючая праца «Очерки истории школы и педагогической мысли народов СССР. Вторая половина XIX в.» (Москва, 1976) змяшчала главу «Школа и педагогическая мысль Белоруссии», падрыхтаваную М. К. Кірылавым і С. А. Умрэйкам. Яна адрознівалася ад папярэдніх работ больш пераканаўчай матывацыяй і факталагічнай аргументаванасцю і, як следства, расстаноўкай дастаткова правільных і скарэктаваных навукай акцэнтаў адносна ўжо набыўшага аскоміну сцвярджэння аб «гаротным стане нацыянальнай беларускай культуры і школы». Аўтары справядліва канстатуюць, што паўстанне 1863–1864 гг. і яго наступствы прадвызначылі спецыфіку адукацыйнай палітыкі царскага ўрада ў Беларусі і Літве. Упершыню ў падобнага роду даследаванні падкрэслівалася, што «на працягу амаль усёй другой паловы XIX ст. ўрад захоўваў ў беларускіх губернях напаўвайсковую адміністрацыю і жорстка пераследваў нацыянальную культуру», што ў тэксце главы раскрываецца на аснове шматлікіх фактаў і аргументаў.

У 1985 г. у Мінску выйшла ў свет абагульняючае гісторыка-педагагічнае даследаванне беларускіх аўтараў «Асвета і педагагічная думка ў Беларусі: са старажытных часоў да 1917 г.», дзе на аснове шматлікіх архіўных крыніц і дарэвалюцыйнай літаратуры дадзены комплексны аналіз асноўных умоў, тэндэнцый, асаблівасцяў і кірункаў развіцця народнай адукацыі і педагагічнай думкі Беларусі. Дадзенае выданне выглядае больш навукова і аргументавана ў параўнанні з «Очерками истории школы и педагогической мысли народов СССР: Конец XIX – начало XX вв.» (Москва, 1991 г.), дзе другая глава «Школа и педагогическая мысль в Белоруссии» раздзела «Школа и педагогическая мысль народов России» утрымлівае шматлікія дадзеныя (табліцы, лічбы, адсоткі), але не змяшчае гісторыка-педагагічнага аналізу, абагульненняў і высноў.

У 1986 г. у Маскве ў серыі «Антология педагогической мысли народов СССР» выйшла «Антология педагогической мысли Белорусской ССР» пад рэдакцыяй акадэміка М. А. Лазарука і дацэнта кафедры педагогікі БДУ М. С. Мяцельскага, дзе прааналізавана педагагічная спадчына беларускага народа са старажытных часоў да 80-х гг. XX ст. У кнізе прадстаўлены персаналіі беларускіх вучоных-педагогаў, асветнікаў, дзеячаў народнай адукацыі, настаўнікаў-метадыстаў, аўтарскія тэксты, матэрыялы аб развіцці народнай асветы, адукацыйнай палітыкі ўрада, грамадска-педагагічным руху, педагагічная журналістыка Беларусі. Актыўны ўдзел у падрыхтоўцы «Анталогіі педагагічнай думкі Беларускай ССР» прымалі выкладчыкі кафедры педагогікі БДУ: М. С. Мяцельскі ахарактарызаваў пытанні народнай асветы ў перыядычным друку Беларусі, У. П. Мешчаракоў раскрыў педагагічныя погляды Л. Зізанія і С. Собаля.

У цэлым, нягледзячы на пашырэнне тэматыкі і ўдасканаленне даследчай методыкі, пераважная большасць навуковых прац перыяду 50–80-х гадоў ХХ ст. несла на сабе глыбокі адбітак стэрэатыпаў і падыходаў савецкіх часоў і марксісцкай ідэалогіі, мела павярхоўна-апісальны характар. Пераважалі працы, якія асвятлялі колькасныя паказчыкі развіцця адукацыі, асветніцкую дзейнасць бальшавікоў, удзел настаўнікаў і вучняў у рэвалюцыйным руху. Персаналіі многіх выбітных дзеячаў беларускага нацыянальна-культурнага адраджэння і іх творы заставаліся пад забаронай.

На мяжы 1980–90-х гг. адбываецца выспяванне якасна новага этапу ў развіцці гісторыка-педагагічных даследаванняў Беларусі. Ажыццяўляецца пераход ад марксісцка-ленінскай метадалогіі да філасофскага, гнасеалагічнага плюралізму. Выкладчыкі і навукоўцы кафедры педагогікі БДУ засяроджваюцца над пераглядам, пераацэнкай, пераасэнсаваннем гістарычных перыядаў, адукацыйных і педагагічных з'яў, працэсаў і фактаў. Так, у 1990 г. дацэнт У. П. Мешчаракоў выдаў брашуру «Асветніцкая дзейнасць і педагагічныя погляды Францыска Скарыны», дзе прасочваюцца своеасаблівасці асветніцка-вухаваўчай і выдавецка-літаратурнай дзейнасці Ф. Скарыны, яго гуманістычныя погляды на адукацыю і выхаванне.

У 1993 г. намаганнямі педагогаў-вучоных Нацыянальнага інстытута адукацыі, кафедры педагогікі БДУ і іншых ВНУ краіны надрукавана калектыўная манаграфія «Народная адукацыя і педагагічная навука ў Беларусі (1917–1945 гг.)» пад рэдакцыяй загадчыцы лабараторыі, кандыдата педагагічных навук Г. Р. Сянькевіч. У працы на аснове архіўных дакументаў і матэрыялаў савецкага перыяду раскрываюцца стан, асноўныя тэндэнцыі і асаблівасці развіцця адукацыі і педагагічнай навукі Беларусі. Манаграфія была падрыхтавана ў лабараторыі гісторыі адукацыі і этнапедагогікі Нацыянальнага інстытута адукацыі – адзінага цэнтра гісторыка-педагагічных даследаванняў краіны. Загадчыцай лабараторыі ў 1992–2001 гг. з'яўлялася дацэнт кафедры педагогікі БДУ, кандыдат педагагічных навук С. В. Снапкоўская.

Гэта кніга аказалася апошняй з серыі абагульняючых гісторыка-педагагічных выданняў, выдадзеных у Беларусі ў канцы ХХ і пачатку ХХІ ст. Развіццё далейшых даследаванняў у гэтай галіне педагагічнай навукі адбывалася праз выданне манаграфій і вучэбных дапаможнікаў па асобных перыядах і тэмах гісторыі асветы, адукацыі і педагагічнай думкі Беларусі, даведачнай літаратуры, публікацыю артыкулаў, абарону кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый. Свой уклад у навуковую распрацоўку гэтай тэматыкі, яе выкладанне ва ўніверсітэцкіх аўдыторыях, падрыхтоўку навуковых кадраў вышэйшай кваліфікацыі, экспертызу навуковых прац, папулярызацыю гістарычных, педагагічных, культуралагічных, філалагічных ведаў уносіла аўтар гэтых радкоў.

Гісторыяграфічны аналіз выявіў наяўнасць трох асноўных этапаў у даследаванні праблемы развіцця адукацыі і педагагічнай думкі Беларусі другой паловы XIX – пачатку XX ст. Першы – дасавецкі, характарызуецца двума падыходамі – урадавым, афіцыйным, якія стаяць на пазіцыях «заходнерусізму» і нацыянальным, нацэленым на распрацоўку асноў нацыянальнай сістэмы адукацыі. Другі этап – савецкі, заснаваны на марксісцкай метадалогіі, аднак пасля 60-х гг. XX ст. ён схіляўся да пераацэнкі дарэвалюцыйнага гісторыка-педагагічнага вопыту з пазіцый гнасеалагічнага падыходу. Трэці – постсавецкі перыяд, характарызуецца комплексным падыходам у пераасэнсаванні дасавецкай і савецкай педагогікі, арыентаваным на нацыянальныя ідэалы і каштоўнасці.

Навуковая навізна даследаванняў аўтара заключаецца ў ажыццяўленні навукова-тэарэтычнага і логіка-гістарычнага аналізу канцэптуальных асноў развіцця айчыннай педагогікі на працягу XIX–XX стст., прадстаўленні канцэптуальнай мадэлі працэсу развіцця асноўных напрамкаў айчыннай педагагічнай навукі у пераемнасці і наватарстве ідэй, якія распрацоўваліся ў дарэвалюцыйнай, савецкай і постсавецкай педагогіцы, а таксама педагогіцы беларускага замежжа.

***П. А. Вадап'янаў,***
член-карэспандэнт НАН Беларусі,
доктар філасофскіх навук, прафесар

## Універсалізм двойчы доктара навук, прафесара С. В. Снапкоўскай у галіне гісторыі і тэорыі педагогікі, культуралогіі, гісторыі культуры Беларусі[1]

Святлана Валянцінаўна Снапкоўская – адзін з тых беларускіх даследчыкаў, здольнасць і працавітасць якіх шырока і арыгінальна выявілася ў розных гуманітарных навуковых сферах – педагогіцы, гісторыі асветы і культуры Беларусі, айчыннай, беларускай гісторыі, культуралогіі. С. В. Снапкоўская – наша сучасніца – доктар педагагічных, доктар гістарычных навук, прафесар, аўтар дзевяці манаграфій, дванаццаці падручнікаў, вучэбна-метадычных дапаможнікаў, бібліяграфічных паказальнікаў і навукова-асветніцкіх брашур, удзельнік шэрагу калектыўных манаграфій па гісторыі адукацыі, культуры і грамадска-асветніцкай і педагагічнай думкі ў Беларусі, больш за двухсот артыкулаў па розных аспектах этнакультурнай ідэнтычнасці беларусаў. Манаграфіі звычайна

[1] Гл. *Вадап'янаў П. А.* Універсалізм даследчыка, педагога і арганізатара: да 40-годдзя навуковай дзейнасці С. В. Снапкоўскай // Снапкоўская С. В. Пераемнасць і наватарства ў святле адукацыі і культуры. Мінск : БДУ, 2020. С. 3–12.

падсумоўваюць навуковыя пошукі і здабыткі даследчыка за пэўны этап творчасці; актуальная навуковая думка рэалізуецца ў артыкулах, калектыўных працах, канферэнцыйных дакладах і паведамленнях, публікацыях у беларускіх і замежных энцыклапедыях і даведніках.

Святлана Валянцінаўна нарадзілася ў Мінску ў сям'і служачых. Пакуль бацькі атрымлівалі адукацыю і працавалі, гадуючы дзвюх дачок, яна выхоўвалася над Мінскам у Астрашыцкім гарадку ў матчыных бацькоў – аднаго з кіраўнікоў партызанскага руху Афанасія Афанасьевіча і Любові Цярэнцьяўны Навіцкіх. Таксама любіла разам з бацькам бываць на яго радзіме – на Нёмане, дзе з зацікаўленасцю і замілаваннем прыслухоўвалася да змешанай польска-беларускай гаворкі. Яе памяць захавала ўспаміны і перажыванні дзяцінства і юнацтва: заходнебеларуская вёска з яе штодзённым пабытам, вяселлямі і хрэсьбінамі, святамі і песнямі, вечарынкамі і танцамі пад гармонікі, скрыпку, бубен і цымбалы. Традыцыйная культура беларусаў – гэта даўняя любоў прафесара Святланы Снапкоўскай. Сваю ўключанасць у народную культуру і фальклор яна тлумачыць абставінамі дзяцінства, а таксама ўплывам навуковых дасягненняў і адкрыццяў такіх выдатных беларускіх вучоных-універсалістаў як Уладзімір Конан, з якім доўгія гады падтрымлівала творчае супрацоўніцтва і добрыя асабістыя адносіны.

Сваю навуковую дзейнасць яна пачала ў студэнцкія гады з удзелу ў міжвузаўскіх навукова-практычных канферэнцыях. Вучоба на філалагічным факультэце БДУ навучыла прафесіянальна працаваць з першакрыніцамі і даследаваць культурную і літаратурную спадчыну з улікам гістарычнай дынамікі яе развіцця. Грамадскае станаўленне адбывалася на камсамольскай рабоце, а прафісійная, педагагічная дзейнасць пачалася ў якасці выкладчыка кафедры рускай мовы як замежнай падрыхтоўчага факультэта Белдзяржуніверсітэта. Вяртанне да нацыянальнай культурнай традыцыі адбылося ў аспірантуры БДУ на кафедры педагогікі, дзе пачала пісаць кандыдацкую дысертацыю пра развіццё асветы і педагагічнай думкі ў Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст. Аналіз першакрыніц па тэме яна пачала з архіваў, аддзела рэдкай кнігі былой Ленінкі. Там захаваліся камплекты перыядычнага друку Беларусі, дзе прачытала і прагледзела шматлікія беларускія крыніцы, ў тым ліку штотыднёвік «Наша Ніва» (1906–1915 гг.), гэта праўдзівае люстэрка беларускага нацыянальна-культурнага адраджэння, станаўлення класічнай літаратуры, беларускай нацыянальнай школы, іншых відаў культуры і грамадскай думкі Беларусі. Гэты неафіцыйны інстытут ці лепш сказаць «феномен» беларускай культуры канчаткова вызначыў навуковыя арыенціры С. В. Снапкоўскай ў даследаванні праблем гісторыі педагогікі, культуры і асветы, арыгінальнай беларускай культуралогіі. У даследчай працы з першакрыніцамі, статыстычнай, мемуарнай, публіцыстычнай і наву-

ковай літаратурай фарміраваліся прафесіянальныя гісторыка-педагагічныя веды ў галіне сумежных навук – айчыннай гісторыі і літаратуразнаўства, фалькларыстыцы, культуралогіі.

Распрацоўкай гісторыка-педагагічных даследаванняў на прафісійным узроўні занялася на кафедры педагогікі БДУ ў якасці суіскальніка, затым ў вочнай аспірантуры. Творчы імпэт і мэтанакіраваная праца садзейнічалі датэрміновай абароне ў Беларускім навукова-даследчым інстытуце адукацыі (зараз Нацыянальны інстытут адукацыі пры Міністэрстве адукацыі Рэспублікі Беларусь) дысертацыі на суісканне вучонай ступені кандыдата педагагічных навук па спецыяльнасці 13.00.01 «тэорыя і гісторыя педагогікі». Наступную працу дацэнта кафедры педагогікі БДУ эфектыўна спалучала з пасадай загадчыка лабараторыі гісторыі адукацыі і этнапедагогікі Нацыянальнага інстытута адукацыі (па сумяшчальніцтве) на працягу 10 гадоў (1991–2001 гг.). Там праводзіліся міждысцыплінарныя даследаванні разам з Инстытутам тэорыі і гісторыі педагогікі Расійскай акадэміі адукацыі, беларускімі ВНУ, архівамі Беларусі, Расіі, Польшчы іЛітвы, Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі, Скарынаўскім цэнтрам. І гэта комплекснае супрацоўніцтва дало плён. Супрацоўнікамі лабараторыі былі абаронены дзве кандыдацкія і адна доктарская дысертацыі, апублікавана больш за 20 кніг – манаграфій і вучэбных дапаможнікаў, энцаклапедычных і навукова-даведачных выданняў для школ и ВНУ.

Пад кіраўніцтвам Святланы Валянцінаўны як адказнага рэдактара і з яе непасрэдным удзелам як складальніка супрацоўнікі лабараторыі гісторыі адукацыі і этнапедагогікі Нацыянальнага інстытута адукацыі апублікавалі навукова-даведачнае выданне «Асвета і педагагічная думка ў Беларусі: Са старажытных часоў да XX ст. Бібліяграфічны паказальнік» (у 2 ч.) і «Асвета і педагагічная думка на Беларусі: Бібліяграфічны паказальнік. Ч. III: 1917–1945 гг.». У гэтым выданні ўпершыню прадстаўлена самае шырокае кола крыніц па гісторыі асветы і педагагічнай думкі ў Беларусі ад старажытнасці да 1945 г. уключна, у тым ліку забароненыя раней для ўпамінання працы рэпрэсіраваных аўтараў, дакументы і матэрыялы аб дзейнасці беларускіх школ за межамі Беларусі, вучэбна-метадычная літаратура аб пачатковай і сярэдняй школе, персаналіі беларускіх дзеячоў народнай асветы і адукацыі, педагагічная журналістыка і інш. Гэтыя выданні сёння з’яўляюцца каштоўнай крыніцай ведаў для настаўнікаў і вучняў, выкладчыкаў і студэнтаў.

У 1995 г. выдавецтва «Народная асвета» апублікавала першую манаграфію С. Снапкоўскай «Ля вытокаў нацыянальнай педагогікі: З гісторыі школы і педагагічнай думкі Беларусі канца XIX – пачатку XX ст.» тыражом 5 тысяч экзэмпляраў. Гэта быў пачатак і адначасова працяг навуковай рэабілітацыі пэўнага этапа станаўлення беларускай педагогікі, заснавальнікаў канцэпцыі беларускай нацыянальнай школы, пазней рэпрэсіраваных, а потым рэабілітаваных.

У рэцэнзіі на кнігу ў часопісе «Полымя» вядомы беларускі філосаф і культуролаг У. М. Конан адзначыў, што «манаграфія Снапкоўскай развівае ўзнікшую яшчэ ў 20-я гады, а пазней прыпыненую традыцыю даследавання школьнага асветніцтва ў кантэксце беларускай і дэмакратычнай расійскай культуры». Рэцэнзент станоўча ацэньвае праведзены аўтарам аналіз школьных навацый і арыгінальных педагагічных ідэй, што абгрунтоўваліся і часткова рэалізоўваліся ў Беларусі, нягледзячы на ўзмацненне ахоўнай урадавай палітыкі. Пераадольваючы казённы фармалізм і псеўдакласічны традыцыяналізм сярэдняй адукацыі, настаўнікі здолелі часткова наблізіць школу да запатрабаванняў рэальнага жыцця канца XIX – пачатку XX ст. Канстатуючы ўклад маладога даследчыка ў навуку, У. М. Конан падрэслівае, што аўтару ўдалося, па-першае, вызначыць дзве асноўныя плыні развіцця педагагічнай тэорыі і практыкі – афіцыйную і нацыянальна-беларускую, і, па-другое, прасачыць непрыкметныя пераходы паміж паўафіцыйнай дэмакратычнай рэгіянальна-рускай педагогікай і новай беларускай педагагічнай думкай нацыянальна-адраджэнскага кірунку[1].

С. В. Снапкоўская – прыхільніца ўніверсалізму і міждысцыплінарнасці ў гуманітарных навуках. Яна не прымае падмены пошуку аб’ектыўнай праўды суб’ектыўнымі «мнениями», а сістэмнасці – эклектычнай кампіляцыяй, здабытай электроннымі сродкамі. Яна супраць падмены тэарэтычнай эксплікацыі тэкстаў культуры фармалістычнай імітацыяй, псеўданавуковай сафістыкай. Гэтымі прынцыпамі класічнай навукі ацэньвала дысертацыі і публікацыі, калі працавала экспертам Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь.

У вучэбным дапаможніку «Народная педагогіка беларусаў», падрыхтаваным калектывам аўтараў пад рэдакцыяй С. В. Снапкоўскай, прасочана развіццё народна-педагагічных ідэй ад сярэдніх вякоў да пачатку XX ст., паказана месца народнай педагогікі ў сістэме этнічнай культуры, дзейнасць і педагагічныя погляды беларускіх вучоных-этнографаў у другой палове XIX ст., раскрыта этнапедагогіка сельскага насельніцтва Беларусі. У прадмове да кнігі член-карэспандэнт НАН Беларусі М. Ф. Піліпенка піша, што чытач можа пазнаёміцца тут з глыбокімі і багатымі традыцыямі беларускай народнай педагогікі, прынцыпамі, тэрмінамі і спосабамі народнага выхавання, даведацца аб даследчыках, якія збіралі, сістэматызавалі, вывучалі і друкавалі матэрыялы аб беларускай народнай педагогіцы ў мінулым, аб выкарыстанні вопыту народнай педагогікі ў агульнаадукацыйнай школе на Беларусі ў папярэднія эпохі[2].

---

[1] *Конан У.* Ці будуць утокі ? // Полымя. 1996. № 6. С. 318–319.
[2] *Піліпенка М. Ф.* Прадмова // Народная педагогіка беларусаў. 1996. С. 4.

Далейшая распрацоўка праблем гісторыі адукацыі, культуры, грамадска-педагагічнага руху на тэрыторыі Беларусі ў парэформанную эпоху прывяла да выдання манаграфіі «Адукацыйная палітыка і школа на Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст.». Кніга выканана на стыку некалькіх гуманітарных навук: гістарычнай, педагагічнай, культуралагічнай. Даследаванне рэгіянальных этнакультурных асаблівасцей развіцця асветы на тэрыторыі «Паўночна-Заходняга краю» дазволіла аўтару прыйсці да шэрагу новых высноў і абагульненняў. У прыватнасці, адзначана, што з гістарычнага пункту гледжання гэтыя асаблівасці з'явіліся аб'ектыўнай праявай нераўнамернасці сацыяльна-эканамічнага, грамадска-палітычнага і этнакультурнага развіцця асобных беларускіх губерняў у складзе Расійскай імперыі. З палітычнага пункту гледжання вырашальнай прычынай ўздзеяння на сістэму народнай асветы Беларусі была школьная палітыка ўрада, якая выкарыстоўвала ў сваіх інтарэсах шматнацыянальныя і поліканфесійныя асаблівасці насельніцтва беларуска-літоўскіх губерняў, а таксама іх розную гісторыка-культурную і цывілізацыйную арыентацыю[1].

У 1997–2000 гг. С. Снапкоўская па запрашэнні рэктара Беларускага дзяржаўнага інстытута ўдасканалення ўрачоў акадэміка НАН Беларусі А. У. Руцкага працавала загадчыцай кафедры педагогікі і псіхалогіі. На базе кафедры сфарміравалася новае вучэбна-метадычнае і навуковае падраздзяленне, якое ўкараняла дасягненні медыцынскай педагогікі. Навуковы і выкладчыцкі вопыт, набыты ёю ў галіне педагагічнай і гістарычнай навук, дапамагаў у навукова-арганізацыйнай дзейнасці па стварэнню і кіраванню кафедрай педагогікі і псіхалогіі. Так прафісійны вопыт і навуковыя веды вучонага і выкладчыка ўзбагачаліся асваеннем новай навукі – псіхалогіі.

Працуючы загадчыкам кафедры педагогікі і псіхалогіі БелМАПА, Святлана Валянцінаўна працягвала рыхтаваць доктарскую дысертацыю. Яе тэматыка была асэнсаваннем і развіццём праблем, узнятых у кандыдацкай працы. Разам з тым даследаванне ўрадавай адукацыйнай палітыкі і асноўных тэндэнцый развіцця асветы і культуры ў Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. патрабавала выйсця за межы педагагічнай навукі. З гэтай мэтай былі ўсталяваны творчыя кантакты з калектывам Інстытута гісторыі НАН Беларусі. У выніку навуковай стажыроўкі ў аддзеле гісторыі Беларусі канца XVIII – пачатку XX ст. у кастрычніку 1999 г. яна паспяхова абараніла ў Інстытуце гісторыі НАН Беларусі дысертацыю на суісканне вучонай ступені доктара гістарычных навук па тэме «Адукацыйная палітыка царызму і педагагічная думка ў Беларусі (60-я гады XIX ст. – 1917 г.)».

[1] *Снапкоўская С. В.* Адукацыйная палітыка і школа на Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст. Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 1998. С. 24.

Як адзначалася ў заключэнні спецсавета па абароне дысертацый, у працы комплексна даследаваны гістарычныя і гісторыка-педагагічныя з’явы, працэсы, падзеі, веды і ўяўленні аб развіцці асветы і адукацыйнай палітыцы царызму ў Беларусі ва ўзаемасувязі ўнутраных і знешніх фактараў і іх эвалюцыі. Дысертанткай было ўстаноўлена, што дасягнуты ў парэформенны перыяд прагрэс у галіне адукацыі насельніцтва Беларусі стаў вынікам дыялектычнага, супярэчлівага ўзаемадзеяння ўнутраных, беларускіх, і знешніх, па-за беларускіх фактараў развіцця нацыянальнай культуры і асветы. З аднаго боку, дзейнічалі заканамернасці сацыяльна-эканамічнага, грамадска-палітычнага, духоўна-культурнага і этнанацыянальнага развіцця беларускага грамадства, якое стала на шлях мадэрнізацыі і нацыянальна-культурнага адраджэння. З другога боку, яго эканамічнае і культурнае жыццё адбывалася ва ўмовах выключных для Беларусі законаў, што былі ўсталяваны царскім урадам пасля паўстання 1863–1864 гг.[1]

У навуковых і навукова-метадычных працах 2003–2010 гг., калі С. В. Снапкоўская працавала саветнікам рэктара БДУ, а затым загадчыкам кафедры тэорыі і гісторыі культуры БДПУ імя Максіма Танка, яна ажыццявіла ўкараненне вынікаў навуковых даследаванняў ў адукацыйны працэс сістэмы паслядыпломнай адукацыі і педагагічных вну Рэспублікі Беларусь праз выданне вучэбна-метадычных дапаможнікаў: «Гісторыя адукацыі і педагагічнай думкі Беларусі (60-я гады XIX – пачатак XX ст.)» (2001 г.), «Гісторыя адукацыі і педагагічнай навукі» (2006) і чытанне лекцый, правядзенне семінараў, пасяджэнняў навукова-праблемных груп. Асэнсаванне і абагульненне назапашанага навукова-тэарэтычнага і практычнага вопыту ў кантэксце гісторыі і культуры Беларусі знайшло выраз у выданні пад рэдакцыяй С. В. Снапкоўскай навучальнага дапаможніка для студэнтаў ВНУ «Асновы культуралогіі» (2008).

Шэраг публікацый па гісторыка-педагагічнай і культуралагічнай тэматыцы змешчаны ў замежных выданнях на англійскай, нямецкай і польскай мовах. Святланай Снапкоўскай упершыню быў прадстаўлены інфармацыйны артыкул пра гісторыка-педагагічныя даследаванні ў Беларусі для Міжнароднага даведніка па даследаваннях у галіне гісторыі адукацыі, які выдаецца Міжнароднай пастаяннай канферэнцыяй па гісторыі адукацыі ў Берне[2]. Абагульняючы артыкул пра замежныя педа-

[1] Заключэнне савета Д 01.40.01 па абароне дысертацый на суісканне вучонай ступені доктара навук у Інстытуце гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па абароне доктарскай дысертацыі Снапкоўскай С. В. «Адукацыйная палітыка царызму і педагагічная думка ў Беларусі (60-я гады XIX ст. – 1917 г.)». 8 кастрычніка 1999 г. (Архіў С. В. Снапкоўскай).

[2] *Snapkovskaya S.* Historical-pedagogical studies in Belarus // International Guide for Research in the History of Education: International Stating Conference for the History of Education / ed. by Pierre Caspard. 2nd ed. – Bern: Peter Lang S. A., 1995. P. 35–40.

гагічныя ўплывы і «пагранічныя пераходы» ў Беларусі з сярэднявечча да 1917 г. апублікавны ў томе «Педагагічныя хадакі праз граніцы ў Еўропе», што выйшаў у серыі «Гісторыя адукацыі і еўрапейская ідэнтычнасць», якая выдавалася ў Аўстрыі і Германіі[1]. У шэрагу артыкулаў, змешчаных у польскіх навуковых выданнях, прааналізавана праблематыка, звязаная з нацыянальнымі каштоўнасцямі і нацыянальнай свядомасцю ў беларускай і расійскай педагагічнай думцы[2].

У 2010–2013 гг. С. В. Снапкоўская працавала ў Федэральнай нацыянальна-культурнай аўтаноміі (ФНКА) «Беларусы Расіі» намеснікам выканаўчага дырэктара, затым намеснікам старшыні ФНКА па пытаннях культуры, педагогікі і адукацыі. У 2011 г. у Маскве яна апублікавала манаграфію «Развитие образования и педагогической мысли на территории Беларуси во второй половине XIX – начале XX в.», якая грунтуецца на комплексным даследаванні і крытычным аналізе шматлікіх першакрыніц: архіўных матэрыялаў, афіцыйных статыстычных выданняў, пратаколаў і справаздач, кніг і перыядычнага друку, якія даўно сталі бібліяграфічнай рэдкасцю. У працы абгрунтавана неабходнасць спалучэння ў гісторыка-педагагічным даследаванні часоў Расійскай імперыі трох метадалагічных парадыгмаў: правінцыйнай, рэгіянальнай і агульнарасійскай. Гэта дазволіла стварыць тэарэтычныя мадэлі нацыянальнай адукацыі ў шматнацыянальнай, шматэтнічнай дзяржаве, якія ў сваю чаргу паслужылі падмуркам для стварэння абагульняючага механізму функцыянавання беларускай нацыянальнай школы[3].

Шляхам асэнсавання назапашанага вопыту мадэлявання, зыходзячы з аксіялагічнага падыходу, была распрацавана аўтарская рэтраспектыўная фреймавая мадэль адукацыі, накіраваная на гарманізацыю нацыянальнага і ўніверсальнага кампанентаў у гісторыка-культурным кантэксце и прадстаўлена прагнастычная мадэль развіцця беларускай нацыянальнай школы. Дадзеная мадэль мае фрэймавую структуру, што дазваляе на тэарэтычным узроўні вывозіць парадыгму развіцця адукацыі, напаўняючы кожны фрэйм канкрэтна-гістарычным альбо эталонным зместам.

---

[1] *Snapkowskaya S., Snapkouski U.* Ausländische pädagogische Einflüsse und Grenzgänge in Belarus von den Anfängen bis 1917 // Pädagogische Grenzgänger in Europa / Elmar Lechner (Hrsg.). – Frankfurt am Main : Peter Lang S. A, 1997. S. 333–350.

[2] *Snapkowska S.* Problem wartości narodowych w rosyjskiej myśli pedagogicznej początku XX w. // Edukacja a wizje świata. Pod red. Józefa Kwapiszeskiego. Słupsk, Wydawnictwo Naukowe Akademii Pomorskiej, 2002. S. 200–211; Ją źe. Świadomość narodowa jako wartość ogólnoludzka i drogi jej kształtowania // Futurologia pedagogiczna. Niekonwencjonalne sposoby rozwiązania konwencjonalnych problemów w edukacji. Pod red. E.Gaweł-Luty i M. Szczepańskiej. Słupsk, Wydawnictwo Naukowe Akademii Pomorskiej, 2005. S. 119–126.

[3] *Снапковская, С. В.* Развитие образования и педагогической мысли Беларуси во второй половине XIX – начале XX в. М. : УРАО ИТИП, 2011. С. 55–57, 179–199.

У перыяд працы ў Маскве С. В. Снапкоўская прайшла стажыроўку ў Інстытуце гісторыі і тэорыі педагогікі Расійскай акадэміі адукацыі, дзе падрыхтавала доктарскую дысертацыю па тэме «Развитие образования и педагагической мысли Беларуси: 60-гг. XIX – начало XX вв.» па спецыяльнасці «Тэорыя і гісторыя педагогікі», якую паспяхова абараніла ў 2012 г. Тэарэтычная значнасць выкананага даследаваня заключалася ў тым, што выяўлены агульныя культурна-гістарычныя дэтэрмінанты і раскрыты тэарэтычныя асновы вядучых напрамкаў развіцця адукацыі і педагагічнай думкі Беларусі, што ўзбагачае матадалогію гісторыка-педагагічных даследаванняў; удакладнены тэарэтычныя ўяўленні аб механізмах узаемадзеяння знешніх і ўнутраных фактараў развіцця адукацыі і педагагічнай думкі; ахарактарызаваны этнакультурныя асаблівасці развіцця асветы і педагагічнай думкі Беларусі як заходняй ускраіны Расійскай дзяржавы[1].

У працах апошніх гадоў С. В. Снапкоўская абгрунтавала новы навуковы напрамак у педагагічных і культуралагічных даследаваннях – праблему беларуска-расійскага культурна-педагагічнага памежжа. Яго апрабацыя адбылася ў рамках міжнародных Ліхачоўскіх чытанняў (Санкт-Пецярбург), на сессіях Навуковага савета па гісторыі адукацыі і педагагічнай навукі Інстытута тэорыі і гісторыі педагогікі Расійскай акадэміі адукацыі, у педагагічным друку Беларусі, Расіі і Польшчы. Апісаны гістарычны феномен беларуска-расійскага культурна-педагагічнага памежжа, як і праблема фарміравання і захавання нацыянальнай ідэнтычнасці[2]. Гэта зроблена праз тэарэтычную распрацоўку і практычнае ўкараненне сістэмы маральных каштоўнасцей у культурна-адукацыйны працэс ў рамках навуковага праекта Інстытута сусветнай эканомікі і міжнародных адносін РАН.

---

[1] Заключение диссертационного совета ДМ 212.162.05 при ФГБОУ ВПО «Нижегородский государственный архитектурно-строительный университет» по диссертации на соискание ученой степени доктора педагогических наук С. В. Снапковской «Развитие образования и педагогической мысли на территории Беларуси в 60-е гг. XIX – начале XX в.». 24 сентября 2012 г. (Архіў С. В. Снапкоўскай).

[2] *Снапковская, С. В.* Генезис формирования российско-белорусского культурного диалога // Диалог культур: ценности, смыслы, коммуникации. XIII Международные Лихачевские научные чтения (Санкт-Петербург, 16–17 мая 2013 г.). СПб. : Издательство СПбГУП, 2013. С. 247–248; *Ее же*. «Культурно-педагогическое пограничье» как фактор развития национальных ценностей образования в Беларуси // Национальные ценности в образовании: история и современность: Материалы XVII сессии Науч. совета по проблемам истории образов. и пед. науки (Москва, 15–16 окт. 1996 г.). М. : Рос. акад. образования, 1996. С. 210–214; *Ее же*. Феномен культурно-педагогического пограничья в просвещении и педагогической мысли Беларуси: с древнейших времен до начала XVII в. // Новое в психолого-педагогических исследованиях. 2010. № 3 (19). Июль-сентябрь. С. 153–164.

На падставе аксіялагічнага падыходу даследчыца прааналізавала і раскрыла асноўныя дамінанты беларускай культуры, вызначыла ключавыя этапы і асаблівасці развіцця беларускай культуралагічнай думкі Беларусі. Гэта знайшло адлюстраванне ў вучэбным дапаможніку «Культуралагічная думка Беларусі» (2017), у якім распрацаваны шляхі ўвядзення маральных каштоўнасцей у сучасны адукацыйны працэс. У якасці гэтых шляхоў упершыню прапанаваны наступныя напрамкі: 1) *музейна-педагагічны* – сукупнасць навукова-асветніцкіх мерапрыемстваў, арыентаваных на сацыялізацыю асобы на аснове сінтэзу сістэмы маральных каштоўнасцей і сучасных музейных тэхналогій; 2) *культурна-адукацыйны* – сістэма адукацыйна-выхаваўчых і культурна-асветніцкіх мер, скіраваная на фарміраванне і развіццё творчай асобы праз арыентацыю навучальнага працэсу на каштоўнасці нацыянальнай культуры і іх актуалізацыю; 3) *інфармацыйна-асветніцкі* – сістэмная праца, скіраваная на папулярызацыю і прапагандаванне здабыткаў нацыянальнай культуры сродкамі масавай інфармацыі, у тым ліку праз спецыялізаваныя выданні[1]. На аснове аналізу гісторыка-культурных ведаў распрацавана адпаведная методыка ўкаранення сістэмы маральных каштоўнасцей у сучасны культурна-адукацыйны працэс.

Падагульняючы амаль 45-гадовы перыяд навуковай дзейнасці С. В. Снапкоўскай, можна адзначыць, што яе адметнай асаблівасцю былі даследаванні на стыку некалькіх гуманітарных навук: педагагічнай, гістарычнай, культуралагічнай. Яна пачынала як даследчык гісторыі адукацыі і педагагічнай думкі Беларусі рубяжа XIX–XX ст., што адпавядала класічнаму напрамку педагагічнай навукі. Наступнае паглыбленне распрацоўкі дадзенай тэматыкі, яе храналагічнае і праблемнае пашырэнне, асабліва на галіну грамадска-палітычных працэсаў і адукацыйнай палітыкі царскага ўрада на тэрыторыі беларуска-літоўскіх губерняў, прывялі да неабходнасці вывучыць адукацыйна-педагагічныя з’явы з пункту гледжання гістарычнай навукі і педагагічнай паліталогіі. Так нарадзіліся манаграфіі і доктарская дысертацыя аб адукацыйнай палітыцы, культуры, школе і педагагічнай думцы на Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX вв., выкананыя з дапамогай метадаў, перш за ўсё, гістарычнай навукі па спецыяльнасці «Айчынная гісторыя».

Логіка грамадскага і культурнага развіцця нашай краіны, якая трывала рухаецца па шляху незалежнасці, як і патрэбнасці сінтэзу навуковых даследаванняў, штурхалі да таго, каб зноў паглядзець на складаныя і неадназначныя пытанні развіцця асветы, культуры, адукацыі, педагагічнай і грамадскай думкі на тэрыторыі Беларусі ў XIX – пачатку XX ст. з пазіцый сучаснай педагагічнай навукі, якая ўсё больш набывае

[1] *Снапкоўская С. В.* Культуралагічная думка Беларусі: вучэб. дапам. / С. В. Снапковская, К. У. Антановіч. Мінск : РІВШ, 2017. С. 152–207.

рысы комплекснай гуманітарнай дысцыпліны. Таксама хацелася паставіць, і па магчымасці вырашыць такую складаную навуковую задачу, як асэнсаванне і параўнанне розных даследчых парадыгмаў, што склаліся ў беларускай і расійскай гісторыка-педагагічных школах, выяўленне іх агульных падыходаў і розных, часам супрацьлеглых канцэпцый у адлюстраванні развіцця адукацыі і педагогікі ў Расійскай імперыі і яе нацыянальных ускраін. Гэта ўдалося, хаця і з пэўнымі цяжкасцямі, зрабіць падчас працы ў Маскве, якая была ўвенчана паспяховай абаронай доктарскай дысертацыі па педагагічных навуках і грамадскай дзейнасцю ў ФНКА «Беларусы Расіі».

З самага пачатку ў сваіх даследаваннях С. Снапкоўская выходзіла на праблематыку гісторыі культуры Беларусі, якую было цяжка і немагчыма аддзяліць ад асветы і адукацыі. Гэтыя культуралагічныя пытанні так ці інакш закранаюцца, ставяцца і вырашаюцца ў яе шматлікіх публікацыях. Абгрунтаваная ў працах апошніх гадоў праблема беларуска-расійскага культурна-педагагічнага памежжа стварае новы напрамак у педагагічных і культуралагічных даследаваннях, які будзе садзейнічаць умацаванню нацыянальнай ідэнтычнасці беларусаў і развіццю навукова-адукацыйных сувязяў з нашымі суседзямі. Аўтару гэтых радкоў, які ведае Святлану з яе студэнцкіх гадоў, застаецца толькі пажадаць педагогу-даследчыку далейшых творчых поспехаў і новых дасягненняў у гуманітарных навуках.

## Аб асноўных напрамках і выніках навуковай дзейнасці ў галіне гісторыі адукацыі, культуры і педагагічнай навукі Беларусі[1]

У артыкуле прадстаўлены асноўныя напрамкі і вынікі навуковай дзейнасці прафесара кафедры культуралогіі факультэта сацыякультурных камунікацый Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, доктара педагагічных навук, доктара гістарычных навук С. В. Снапкоўскай ў галіне гісторыі адукацыі, культуры і педагагічнай навукі Беларусі ў сувязі з вылучэннем яе кандыдатуры на абранне членам-карэспандэнтам НАН Беларусі

[1] Тэкст артыкула, прадстаўленага да публікацыі ў часопісе «Весці НАН Беларусі» ў якасці кандыдата ў члены-карэспандэнты НАН Беларусі па спецыяльнасці «Педагогіка». На падставе артыкула падрыхтаваныя тэзісы выступлення доктара педагагічных навук, доктара гістарычных навук прафесара С. В. Снапкоўскай на Агульнай сесіі Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў НАН Беларусі падчас выбараў у члены-карэспандэнты НАН Беларусі па спецыяльнасці «Педагогіка» 2 лістапада 2017 г.

па спецыяльнасці «Педагогіка». Разглядаюцца этапы навуковай біяграфіі на працягу амаль 40 гадоў, вынікі даследаванняў, што выконваліся на стыку некалькіх гуманітарных навук: педагагічнай, гістарычнай, культуралагічнай і іншых. Характарызуюцца асноўныя навуковыя працы: манаграфіі, вучэбныя і бібліяграфічныя дапаможнікі, пастановачныя артыкулы. Паказаны ўклад аўтара ў навуку праз распрацоўку новых метадалагічных парадыгмаў і падыходаў, гісторыка-педагагічнае абгрунтаванне канцэпцыі нацыянальнай школы ў Рэспубліцы Беларусь, увядзенне рэтраспектыўнай фреймавай мадэлі адукацыі, накіраванай на гарманізацыю нацыянальнага і ўніверсальнага кампанентаў у гісторыка-культурным кантэксце, і прагнастычнай мадэлі развіцця беларускай нацыянальнай школы, пастаноўку праблемы беларуска-расійскага культурна-педагагічнага памежжа, даследаванне гістарычных і сучасных праблем развіцця адукацыі, культуры і педагагічнай навукі Беларусі.

Сваю навуковую дзейнасць пачала ў студэнцкія гады з удзелу ў міжвузаўскіх навукова-практычных канферэнцый, затым у якасці выкладчыка кафедры рускай мовы як замежнай падрыхтоўчага факультэта Белдзяржуніверсітэта. Распрацоўкай гісторыка-педагагічных даследаванняў на прафісійным узроўні занялася на кафедры педагогікі БДУ ў якасці суіскальніка, затым – у вочнай аспірантуры, куды паступіла ў 1989 г. У маі 1991 г. датэрмінова абараніла ў Беларускім навукова-даследчым інстытуце адукацыі (зараз Нацыянальны інстытут адукацыі пры Міністэрстве адукацыі Рэспублікі Беларусь) дысертацыю на суісканне вучонай ступені кандыдата педагагічных навук па тэме «Общественно-педагогическое движение и педагогическая мысль в Белоруссии (90-е годы XIX в. – 1917 г.)» (спецыяльнасць 13.00.01 «Тэорыя і гісторыя педагогікі»). Навуковым кіраўніком з’яўляўся кандыдат педагагічных навук, дацэнт БДУ М. С. Мяцельскі.

З 1991 па 1997 гг. працавала дацэнтам кафедры педагогікі БДУ. Адначасова з 1991 па 2001 гг. была загадчыкам лабараторыі гісторыі адукацыі і этнапедагогікі Нацыянальнага інстытута адукацыі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь (па сумяшчальніцтве). Супрацоўнікамі лабараторыі за гэты час былі абаронены дзве кандыдацкія і адна доктарская дысертацыі, выдадзена 7 кніг (4 манаграфіі і 3 навучальных дапаможнікі).

У 1995 г. апублікавала першую манаграфію «Ля вытокаў нацыянальнай педагогікі: З гісторыі школы і педагагічнай думкі Беларусі канца XIX – пачатку XX ст.», у якой раскрыла стан і тэндэнцыі развіцця асветы і педагагічнай думкі Беларусі ў 1890–1917 гг. У кнізе падсумаваны даследаванні беларускіх вучоных (педагогаў і гісторыкаў) па дадзенай праблеме ў савецкія часы і вырашаны шэраг новых навуковых задач, якія паўсталі перад беларускай гісторыка-педагагічнай навукай пасля абвяшчэння

нашай краінай незалежнасці. Як адзначаецца ва ўводзінах, выкарыстаныя аўтарам архіўныя дакументы і матэрыялы дазволілі «наблізіцца да аб'ектыўнага аналізу стану і развіцця беларускага адраджэння і школы канца XIX – пачатку XX ст.» [1, с. 4–5]. У манаграфіі ўпершыню разгледжаны шэраг важных пытанняў развіцця асветы і педагагічнай думкі Беларусі даследаванага перыяду, які ўвайшоў у гісторыю як час беларускага нацыянальна-культурнага адраджэння: паказаны вядучыя фактары і ўмовы развіцця школы і педагагічнай думкі Беларусі, прааналізаваны асноўныя формы і метады вучэбна-выхаваўчага працэсу ў пачатковых і сярэдніх школах беларускіх губерняў. Аўтарам раскрыта сувязь паміж развіццём народнай асветы і грамадска-педагагічным рухам, які нарадзіўся ў нешматлікім, але актыўным асяроддзі беларускіх настаўнікоў, вучняў і іх бацькоў. Яшчэ адным нашым творчым адкрыццём было вяртанне ў гісторыка-педагагічную навуку забароненых ці наўмысна забытых раней імёнаў дзеячаў асветы, культуры і навукі, якія заклалі асновы беларускай нацыянальнай школы.

Пад маім кіраўніцтвам як адказнага рэдактара і з непасрэдным удзелам як складальніка супрацоўнікі лабараторыі гісторыі адукацыі і этнапедагогікі Нацыянальнага інстытута адукацыі апублікавалі навукова-даведачнае выданне «Асвета і педагагічная думка ў Беларусі: Са старажытных часоў да XX ст. Бібліяграфічны паказальнік» (У 2 ч.) [2; 3] і «Асвета і педагагічная думка на Беларусі: Бібліяграфічны паказальнік. Ч. III: 1917–1945 гг.» [4]. У гэтым выданні ўпершыню сабрана самае шырокае кола крыніц па гісторыі асветы і педагагічнай думкі ў Беларусі ад старажытнасці да 1945 г. уключна, у тым ліку працы рэпрэсіраваных аўтараў, дакументы і матэрыялы аб дзейнасці беларускіх школ за межамі Беларусі, вучэбна-метадычная літаратура аб пачатковай і сярэдняй школе, персаналіі беларускіх дзеячоў народнай асветы і адукацыі, педагагічная журналістыка і інш.

У навучальным дапаможніку «Народная педагогіка беларусаў» (1996 г.), падрыхтаваным калектывам аўтараў пад нашай рэдакцыяй, прасочана развіццё народна-педагагічных ідэй ад сярэдніх вякоў да пачатку XX ст., паказана месца народнай педагогікі ў сістэме этнічнай культуры, дзейнасць і педагагічныя погляды беларускіх вучоных-этнографаў у другой палове XIX ст., раскрыта этнапедагогіка сельскага насельніцтва Беларусі [5].

Далейшая распрацоўка праблем гісторыі адукацыі, культуры, грамадска-педагагічнага руху на тэрыторыі Беларусі ў парэформанную эпоху прывяла да выдання манаграфіі аб адукацыйнай палітыцы царызму ў канцы XIX – пачатку XX ст. [6]. Даследаванне рэгіянальных этнакультурных асаблівасцей развіцця асветы на тэрыторыі «Паўночна-Заходняга краю» дазволіла абгрунтаваць іх характэрныя рысы аб'ектыўнымі заканамернасцямі і палітычнай дзейнасцю царскага ўрада. З аднаго боку,

асаблівасці развіцця асветы і адукацыі з'яўляліся праявай нераўнамернасці сацыяльна-эканамічнага, грамадска-палітычнага і этнакультурнага развіцця асобных беларускіх губерняў у складзе Расійскай імперыі. З другога боку, дзейнічалі грамадска-палітычныя фактары, абумоўленыя палітыкай ўрада. Таму вырашальнай прычынай ўздзеяння на сістэму народнай асветы Беларусі была школьная палітыка ўрада, якая выкарыстоўвала ў сваіх інтарэсах шматнацыянальны і поліканфесійны склад насельніцтва беларуска-літоўскіх губерняў, а таксама іх розную гісторыка-культурную і цывілізацыйную арыентацыю. У гэтым сэнсе палітыка цэнтральных улад адносна ўсходне- і цэнтральнабеларускіх губерняў (Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай) істотна адрознівалася ад адукацыйнай палітыкі адносна заходняй частцы Беларусі (Гродзенская і пераважная частка Віленскай губерні). Менавіта ўздзеяннем такой дыферэнцыраванай адукацыйнай палітыкі можна растлумачыць значныя адрозненні па асноўных паказчыках развіцця адукацыі асобных беларускіх губерняў і рэгіёнаў, што было выяўлена і абгрунтавана ў манаграфіі. Кніга выканана на стыку некалькіх гуманітарных навук: гістарычнай, педагагічнай, культуралагічнай.

У 1997 г. запрошана рэктарам Беларускага дзяржаўнага інстытута ўдасканалення ўрачоў (у далейшым – БелМАПА) акадэмікам НАН Беларусі А.У.Руцкім на працу ў Інстытут з мэтай стварэння кафедры педагогікі і псіхалогіі. За тры гады напружанай працы гэтая задача была паспяхова выканана. У складзе БДІУУ вакол кафедры педагогікі і псіхалогіі сфарміравалася новае вучэбна-метадычнае і навуковае падраздзяленне, якое авалодала і ўкараніла ў паслядыпломную практыку павышэння кваліфікацыі ўрачоў ідэі і дасягненні новай галіны навукі – медыцынскай педагогікі. Для выкладчыкаў і слухачоў Інстытута было падрыхтавана некалькі вучэбна-метадычных распрацовак аб ролі лекцыі як форме навучання ў медыцынскім вну. У сваёй навукова-арганізацыйнай дзейнасці па стварэнню і кіраванню кафедрай выкарыстоўвала ўласны навуковы і выкладчыцкі вопыт гісторыі асветы, адукацыйнай палітыкі і педагагічнай думкі Беларусі.

У гэты час апублікавала брашуры аб асноўных тэндэнцыях развіцця школы на тэрыторыі Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст. і шляхах рэфармавання сярэдняй школы ў СССР і БССР ў канцы 50-х – пачатку 60-х гадоў XX ст., якія былі выкарыстаны ў 1997 г. падчас парламенцкіх слуханняў па праблемах рэфармавання школы ў Палаце прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь [7; 8]. У іх раскрыты механізм рэалізацыі шэрагу школьных рэформаў, што дазволіла выявіць логіку трансфармацыйных фактараў у сучасным адукацыйным працэсе.

Працуючы загадчыкам кафедры педагогікі і псіхалогіі БелМАПА, працягвала рыхтаваць доктарскую дысертацыю. Яе тэматыка была пра-

цягам і развіццём праблем, узнятых у кандыдацкай працы. Разам з тым даследаванне адукацыйнай палітыкі царызму і асноўных тэндэнцый развіцця асветы і культуры ў Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. патрабавала выйсця за межы педагагічнай навукі. З гэтай мэтай былі ўсталяваны творчыя кантакты з калектывам Інстытута гісторыі НАН Беларусі, у прыватнасці з супрацоўнікамі аддзелаў гісторыі Беларусі канца XVIII –пачатку XX ст. і гісторыі навукі і культуры Беларусі XX ст. У 1998–1999 гг. прайшла навуковую стажыроўку ў аддзеле гісторыі Беларусі канца XVIII – пачатку XX ст., дзе канчаткова вызначыла тэму сваёй доктарскай дысертацыі і навуковага кансультанта ў асобе выдатнага спецыяліста, загадчыка гэтага аддзела, намесніка дырэктара Інстытута гісторыі НАН Беларусі, доктара гістарычных навук, прафессара М. В. Біча. У кастрычніку 1999 г. паспяхова абараніла ў Інстытуце гісторыі НАН Беларусі дысертацыю на суісканне вучонай ступені доктара гістарычных навук па тэме «Адукацыйная палітыка царызму і педагагічная думка ў Беларусі (60-я гады XIX ст. –1917 г.)» (спецыяльнасць 07.00.02 «Айчынная гісторыя»).

У 2003–2005 гг. працавала саветнікам рэктара БДУ, у 2005–2010 гг. загадчыкам кафедры тэорыі і гісторыі культуры БДПУ імя Максіма Танка. У працах гэтага часу ажыццявіла ўкараненне вынікаў навуковых даследаванняў ў адукацыйны працэс сістэмы паслядыпломнай адукацыі і педагагічных ВНУ Рэспублікі Беларусь праз выданне вучэбна-метадычных дапаможнікаў «Гісторыя адукацыі і педагагічнай думкі Беларусі (60-я гады XIX – пачатак XX стст.)» (2001 г.), «Гісторыя адукацыі і педагагічнай навукі» (2006 г.) [9; 10] і чытанне лекцый, правядзенне семінараў, пасядженняў навукова-праблемных груп. Асэнсаванне і абагульненне назапашанага навукова-тэарэтычнага і практычнага вопыту ў кантэксце гісторыі і культуры Беларусі знайшло выраз у выданні пад рэдакцыяй С. В. Снапкоўскай навучальнага дапаможніка для студэнтаў ВНУ «Асновы культуралогіі» (2008 г.) [11].

Шэраг публікацый па гісторыка-педагагічнай і культуралагічнай тэматыцы змешчаны ў замежных выданнях на англійскай, нямецкай і польскай мовах. Аўтарам упершыню быў прадстаўлены інфармацыйны артыкул пра гісторыка-педагагічныя даследаванні ў Беларусі для Міжнароднага даведніка па даследаваннях у галіне гісторыі адукацыі, які выдаецца Міжнароднай пастаяннай канферэнцыяй па гісторыі адукацыі ў Берне[12; 13]. У шэрагу артыкулаў, змешчаных у польскіх навуковых выданнях, прааналізавана праблематыка, звязаная з нацыянальнымі каштоўнасцямі і нацыянальнай свядомасцю ў беларускай і расійскай педагагічнай думцы [14; 15].

З 2010 па 2013 гг. С. В. Снапкоўская працавала ў Федэральнай нацыянальна-культурнай аўтаноміі (ФНКА) «Беларусы Расіі» намеснікам вы-

канаўчага дырэктара, затым намеснікам старшыні ФНКА па пытаннях культуры, педагогікі і адукацыі (Масква). У 2011 г. у Маскве апублікавала манаграфію «Развитие образования и педагогической мысли на территории Беларуси во второй половине XIX – начале XX в.», якая грунтуецца на комплексным даследаванні і крытычным аналізе шматлікіх першакрыніц: архіўных матэрыялаў, афіцыйных статыстычных выданняў, пратаколаў і справаздач, кніг і перыядычнага друку, якія даўно сталі бібліяграфічнай рэдкасцю. У працы абгрунтавана неабходнасць спалучэння ў гісторыка-педагагічным даследаванні часоў Расійскай імперыі трох метадалагічных парадыгмаў: правінцыйнай, рэгіянальнай і агульнарасійскай. Гэта дазволіла стварыць тэарэтычныя мадэлі нацыянальнай адукацыі ў шматнацыянальнай, шматэтнічнай дзяржаве, якія ў сваю чаргу паслужылі падмуркам для стварэння абагульняючага механізму функцыянавання беларускай нацыянальнай школы.

Шляхам асэнсавання назапашанага вопыту мадэлявання, зыходзячы з аксіялагічнага падыходу, была распрацавана аўтарская рэтраспектыўная фреймавая мадэль адукацыі, накіраваная на гарманізацыю нацыянальнага і ўніверсальнага кампанентаў у гісторыка-культурным кантэксце і прадстаўлена прагнастычная мадэль развіцця беларускай нацыянальнай школы. Дадзеная мадэль мае фрэймавую структуру, што дазваляе на тэарэтычным узроўні выводзіць парадыгму развіцця адукацыі, напаўняючы кожны фрэйм канкрэтна-гістарычным альбо эталонным зместам [16, гл. раздзел 4.4 «Моделирование школьного нациостроительства». С. 257–272].

У перыяд працы ў Маскве прайшла стажыроўку ў Інстытуце гісторыі і тэорыі педагогікі Расійскай акадэміі адукацыі, дзе падрыхтавала доктарскую дысертацыю па тэме «Развитие образования и педагогической мысли Беларуси: 60-гг. XIX – начало XX вв.» па спецыяльнасці «Тэорыя і гісторыя педагогікі», якую абараніла ў 2012 г.

Падчас працы ў Маскве падрыхтавана канцэпцыя стварэння і дзейнасці Інстытута беларускай культуры (г. Масква), скіраваная на аказанне адукацыйных паслуг у выглядзе падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі кадраў функцыянераў і актывістаў рэгіянальных і мясцовых нацыянальна-культурных аўтаномій беларусаў Расіі ў галіне вывучэння беларускай мовы, культуры і беларусазнаўства, прававых і эканамічных ведаў (май 2010 г.) [17]. У 2013 г. старшыні ФНКА «Белорусов России» былі накіраваны прапановы па стварэнні ў Мінску Беларуско-расійскага навукова-культурнага цэнтра і пастаянна дзеючага семінара ў Маскве для функцыянераў і актывістаў рэгіянальных і мясцовых нацыянальна-культурных аўтаномій [18]. Прапановы сустрэлі вельмі станоўчы водгук сярод кіраўніцтва і актыва беларускай дыяспары ў Расіі, аднак іх рэалізацыя сутыкнулася з фінансава-арганізацыйнымі цяжкасцямі.

У працах апошніх гадоў намі абгрунтаваны новы навуковы напрамак у педагагічных і культуралагічных даследаваннях – праблема беларуска-расійскага культурна-педагагічнага памежжа. Яго апрабацыя адбылося ў рамках міжнародных Ліхачоўскіх чытанняў (Санкт-Пецярбург) [19; 20], на сесіях Навуковага савета па гісторыі адукацыі і педагагічнай навукі Інстытута тэорыі і гісторыі педагогікі Расійскай акадэміі адукацыі, у педагагічным друку Беларусі, Расіі і Польшчы [21; 22]. Абгрунтаваны гістарычны феномен беларуска-расійскага культурна-педагагічнага памежжа [23; 24], як і праблема фарміравання і захавання нацыянальнай ідэнтычнасці праз тэарэтычную распрацоўку і практычнае ўкараненне сістэмы маральных каштоўнасцей у культурна-адукацыйны працэс ў рамках навуковага праекта Інстытута сусветнай эканомікі і міжнародных адносін РАН [25].

На падставе аксіялагічнага падыходу тэарэтычна абгрунтавала і раскрыла асноўныя дамінанты беларускай культуры, вызначыла ключавыя этапы і асаблівасці развіцця беларускай культуралагічнай думкі Беларусі. Гэта знайшло адлюстраванне ў вучэбным дапаможніку «Культуралагічная думка Беларусі» (2017 г.), у якім распрацаваны шляхі ўвядзення маральных каштоўнасцей у сучасны адукацыйны працэс. Гэтымі шляхамі выступаюць наступныя напрамкі: музейна-педагагічны, культурна-адукацыйны і інфармацыйна-асветніцкі [26, с. 152–207]. На аснове аналізу гісторыка-культурных ведаў распрацавана адпаведная методыка ўкаранення сістэмы маральных каштоўнасцей у сучасны культурна-адукацыйны працэс.

Падагульняючы свой 45-гадовы перыяд навуковай дзейнасці, хацелася б адзначыць, што яе адметнай асаблівасцю былі даследаванні на стыку некалькіх гуманітарных навук: педагагічнай, гістарычнай, культуралагічнай. У дадатак адзначу, што дыплом па вышэйшай адукацыі атрымала па філалагічнай навуцы. Пачынала як даследчык гісторыі адукацыі і педагагічнай думкі Беларусі рубяжа XIX–XX ст., што адпавядала класічнаму напрамку педагагічнай навукі. Наступнае паглыбленне распрацоўкі дадзенай тэматыкі, яе храналагічнае і праблемнае пашырэнне, асабліва на галіну грамадска-палітычных працэсаў і адукацыйнай палітыкі царскага ўрада на тэрыторыі беларуска-літоўскіх губерняў, прывялі да неабходнасці вывучыць адукацыйна-педагагічныя з’явы з пункту гледжання гістарычнай навукі. Так нарадаліся манаграфіі і доктарская дысертацыя аб адукацыйнай палітыцы, культуры, школе і педагагічнай думцы на Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст., выкананыя з дапамогай метадаў, перш за ўсё, гістарычнай навукі па спецыяльнасці «Айчынная гісторыя».

Час ішоў, але заставалася нерэалізаванай мара аб дактарантуры ў Маскве ў лепшай навуковай установе па педагогіцы і абароне доктар-

скай дысертацыі па педагагічнай навуцы. Хацелася прадставіць расійскім і іншым замежным даследчыкам вынікі сваёй працы аб развіцці адукацыі, педагагічнай і грамадскай думкі на тэрыторыі Беларусі ў XIX – пачатку XX ст. Гэта думалася зрабіць шляхам супастаўлення розных даследчых парадыгмаў, што склаліся ў беларускай і расійскай гісторыка-педагагічных школах, выяўлення іх агульных падыходаў і розных, часам супрацьлеглых канцэпцый у адлюстраванні развіцця адукацыі і педагогікі ў Расійскай імперыі і яе нацыянальных ускраін, адной з якіх быў «Паўночна-Заходні край». Успрыманне маіх падыходаў і канцэпцый аказалася нялёгкай задачай для расійскіх калегаў. Аднак з пэўнымі цяжкасцямі мая праца ў Маскве ўвянчалася паспяховай абаронай доктарскай дысертацыі па педагагічных навуках і грамадскай дзейнасцю ў ФНКА «Беларусы Расіі».

З пачатку сваіх даследаванняў мне даводзілася выходзіць на праблематыку гісторыі і тэорыі культуры Беларусі, якую было цяжка і немагчыма аддзяліць ад асветы і адукацыі. Гэтыя культуралагічныя пытанні так ці інакш закранаюцца, ставяцца і вырашаюцца ў нашых шматлікіх публікацыях. Адмысловае адлюстраванне яны знайшлі ў двух навучальных дапаможніках па асновах культуралогіі і культуралагічнай думкі Беларусі, пра якіх ужо ішла гаворка. Абгрунтаваная ў працах апошніх гадоў праблема беларуска-расійскага культурна-педагагічнага памежжа стварае новы напрамак у педагагічных і культуралагічных даследаваннях, які будзе садзейнічаць умацаванню нацыянальнай ідэнтычнасці беларусаў.

Разам з творчай, даследчай і выкладчыцкай працай займалася навукова-арганізацыйнай і вучэбна-адміністрацыйнай дзейнасцю на пасадзе загадчыцы кафедраў: педагогікі і псіхалогіі БелМАПА, тэорыі і гісторыі культуры БДПУ імя Максіма Танка, кіраўніка лабараторыі гісторыі адукацыі і этнапедагогікі Нацыянальнага інстытута адукацыі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, намесніка старшыні ФНКА «Беларусы Расіі» па пытаннях культуры, педагогікі і адукацыі. У 1989–2017 гг. апублікавана 5 манаграфій, 12 вучэбных дапаможнікаў, з іх тры з грыфам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, больш за 200 навуковых артыкулаў, 24 раздзелы ў калектыўных манаграфіях. Шэраг публікацый выйшаў за мяжой.

З'яўлялася членам Экспертнага савета ВАК Рэспублікі Беларусь па педагагічных навуках, членам спецыялізаванага Савета па абароне доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый па педагогіцы пры БДПУ імя Максіма Танка. Падрыхтавала шэраг кандыдатаў педагагічных навук. Супрацоўнічае з айчыннымі і замежнымі навуковымі арганізацыямі і асобнымі вучонымі і спецыялістамі. У цяперашні час з'яўляюся членам Савета БДУ, членам Экспертнага савета па сацыяльна-эканамічным і ду-

хоўна-культурным развіцці Рэспублікі Беларусь пры Міністэрстве адукацыі, членам Вучонага савета факультэта сацыякультурных камунікацый БДУ, членам камісіі па вылучэнні работ на суісканне прэміі імя першага рэктара БДУ У. І. Пічэты.

Калі абагуліць свой асабісты ўклад у навуку і адукацыю нашай краіны, за які кандыдатаў выбіраюць у члены-карэспандэнты НАН Беларусі, то ён выявіўся ў распрацоўцы новых кірункаў у педагагічнай і гістарычнай навуках. У гісторыка-педагагічных даследаваннях гэта адлюстравалася ў раскрыцці вядучых тэндэнцый і заканамернасцей развіцця адукацыі і педагагічнай думкі Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст., выяўленні этнапалітычных, культурна-гістарычных і грамадска-ідэалагічных дэтэрмінантаў і фактараў, якія ўздзейнічалі на сістэму асветы і адукацыі Беларусі як заходняй ускраіны Расійскай імперыі. Інстытуцыянальна нашы педагагічныя і гістарычныя даследаванні развіваліся ў рамках вядучых адукацыйных і навуковых устаноў Беларусі (БДУ, БДПУ, НІА, Інстытут гісторыі НАНБ), а статусна былі афармлены прысуджэннем вучоных ступеней кандыдата педагагічных навук і доктара гістарычных навук, вучоных званняў дацэнта і прафесара. Рэалізацыя мары стаць доктарам педагагічных навук ажыццявілася ў Расійскай Федэрацыі праз абарону доктарскай дысертацыі і прысуджэнне ступені доктара педагагічных навук расійскім ВАКам. Праца ў апошнія гады на кафедры культуралогіі БДУ стымулюе нашы даследаванні тэарэтычных і практыка арыентаваных пытанняў тэорыі і гісторыі культуры Беларусі і замежных краін, культуралагічнай думкі Беларусі, беларуска-расійскага культурнага дыялогу. Такім чынам воляй лёсу і па ўласным прызванні мне давялося і адначасова пашчасціла ажыццявіць шырокі, комплексны, міждысцыплінарны падыход у навуковай і выкладчыцкай працы, аб’яднаўшы тры гуманітарныя навукі – педагогіку, гісторыю і культуралогію. Гэтаму ў значнай ступені садзейнічала базавая адукацыя, атрыманая ў БДУ, – філагаг, выкладчык рускай мовы і літаратуры.

## Бібліяграфічны спіс

1. *Снапкоўская, С. В.* Ля вытокаў нацыянальнай педагогікі: З гісторыі школы і педагагічнай думкі Беларусі канца XIX – пачатку XX ст. / С. В. Снапкоўская. – Мінск : Народная асвета, 1995. – 129 с.

2. Асвета і педагагічная думка на Беларусі: Са старажытнасці да пачатку XX ст. : Бібліяграфічны паказальнік : у 2 ч. / пад рэд. С. В. Снапкоўскай (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 1995. – Ч. 1. – 172 с.

3. Асвета і педагагічная думка на Беларусі: Са старажытнасці да пачатку XX ст.: Бібліяграфічны паказальнік : у 2 ч. / / пад рэд. С. В. Снапкоўскай (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 1995. – Ч. 2. – 205 с.

4. Асвета і педагагічная думка на Беларусі: Бібліяграфічны паказальнік. Ч. III: 1917–1945 гг. / А. Л. Еўдакімава, С. В. Снапкоўская, М. Р. Марчанка, С. І. Паўловіч; пад рэд. С. В. Снапкоўскай. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2001. – 327 с.

5. Народная педагогіка беларусаў / В. М. Конан [і інш.] ; рэд. кал.: В. К. Бандарчык, М. Ф. Піліпенка, С. В. Снапковская (адк. рэд.). Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 1996. – 166 с.

6. *Снапкоўская, С. В.* Адукацыйная палітыка і школа на Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст. / С. В. Снапкоўская. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 1998. – 192 с.

7. *Снапковская, С. В.* Реформирование средней школы в конце 50-х –начале 60-х годов XX в.: опыт и итоги / С. В. Снапковская. – Минск : Нац. ин-т образования, 1997. – 16 с.

8. *Снапкоўская, С. В.* Шляхі развіцця школы на Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст. / С. В. Снапкоўская. – Мінск: Нацыянальны інстытут адукацыі, 1997. – 41 с.

9. *Снапкоўская, С. В.* Гісторыя адукацыі і педагагічнай думкі Беларусі (60-я гады XIX – пачатак XX ст.) : вучэб. дапам. для студэнтаў вышэйш. навуч. устаноў / С. В. Снапкоўская. – Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2001. – 160 с.

10. *Снапкоўская, С. В.* Гісторыя адукацыі і педагагічнай думкі : вучэб.-метад. дапам. / С. В. Снапкоўская. – Мінск : БДПУ, 2006. – 308 с.

11. *Снапкоўская, С. В.* Асновы культуралогіі: канспект лекцый / С. В. Снапкоўская, В. А. Вараб'ёва, В. М. Іўчанка. – Мінск : Асар, 2008. – 272 с.

12. *Snapkovskaya, S.* Historical-pedagogical studies in Belarus // International Guide for Research in the History of Education: International Stating Conference for the History of Education / S. Snapkovskaya; Ed. by Pierre Caspard. 2nd ed. – Bern : Peter Lang S. A., 1995. – P. 35–40.

13. *Snapkowskaya, S.* Ausländische pädagogische Einflüsse und Grenzgänge in Belarus von den Anfängen bis 1917 / S. Snapkowskaya, U. Snapkouski // Pädagogische Grenzgänger in Europa / Elmar Lechner (Hrsg.). – Frankfurt am Main: Peter Lang S. A, 1997. – S. 333–350.

14. *Snapkowska, S.* Problem wartości narodowych w rosyjskiej myśli pedagogicznej początku XX w. / S. Snapkowska // Edukacja a wizje świata. Pod red. Józefa Kwapiszeskiego. Słupsk, Wydawnictwo Naukowe Akademii Pomorskiej, 2002. – S. 200–211.

15. *Snapkowska, S.* Świadomość narodowa jako wartość ogólnoludzka i drogi jej kształtowania / S. Snapkowska // Futurologia pedagogiczna. Niekonwencjonalne sposoby rozwiązania konwencjonalnych problemów w edukacji. Pod red. E.Gaweł-Luty i M. Szczepańskiej. Słupsk, Wydawnictwo Naukowe Akademii Pomorskiej, 2005. – S. 119–126.

16. *Снапковская, С. В.* Развитие образования и педагогической мысли Беларуси во второй половине XIX – начале XX в. / С. В. Снапковская. – М. : УРАО ИТИП, 2011. – 316 с.

17. *Снапковская, С. В.* Предложения о структуре и основных направлениях деятельности независимого Белорусского института в Москве / С. В. Снапковская. – Минск, 19 мая 2010 г. Л. 1–3 (Архіў аўтара).

18. *Снапковская, С. В.* Предложения по созданию в Минске белорусско-российского научно-культурного центра (БРНКЦ) и постоянно действующего семинара в Москве для функционеров и активистов региональных организаций ФНКА «Белорусов России» / С. В. Снапковская. – Минск, 10 июля 2013 г. Л. 1–2 // (Архіў аўтара).

19. *Снапковская, С. В.* Генезис формирования российско-белорусского культурного диалога / С. В. Снапковская // Диалог культур: ценности, смыслы, коммуникации. XIII Международные Лихачевские научные чтения (Санкт-Петербург, 16–17 мая 2013 г.). СПб. : Изд-во СПбГУП, 2013. – С. 247–248.

20. *Снапковская, С. В.* Проблема «западнорусизма» в плоскости национальной идентификации белорусов / С. В. Снапковская // Современные глобальные вызовы и национальные интересы. XV Международные Лихачевские научные чтения СПб. : Изд-во СПбГУП, 2016. – С. 371–373, 423.

21. *Снапковская, С. В.* Этнокультурные особенности развития образования в Белоруссии во второй половине XIX – начале XX в. / С. В. Снапковская // Этнокультурная идентичность народов Украины, Белоруссии и Польши: механизмы формирования и способы проявления. – М. : Ин-т славяноведения, 2011. – С. 165–193.

22. *Snapkowska, S.* Model frejmowy edukacji narodowej jako środek rozwoju wiedzy hcistoryczno-pedagogicznej / S.Snapkowska // Komunikacja w cyberświecie. Rozdzial VI / Redakcja naukowa S. Bembos, Jerzy Plis, Józef Bendarek. Radom, 2012. Wyzsza Szkola Handlowa w Radomiu. – S. 367–380.

23. *Снапковская, С. В.* «Культурно-педагогическое пограничье» как фактор развития национальных ценностей образования в Беларуси / С. В. Снапковская // Национальные ценности в образовании: история и современность : Материалы XVII сессии Науч. совета по проблемам истории образоват. и пед. науки. (Москва, 15–16 окт. 1996 г.). – М. : Рос. акад. образования, 1996. – С. 210–214.

24. *Снапковская, С. В.* Феномен культурно-педагогического пограничья в просвещении и педагогической мысли Беларуси: с древнейших времен до начала XVII в. / С. В. Снапковская // Новое в психолого-педагогических исследованиях. – 2010. – № 3 (19), июль-сентябрь. С. 153–164 .

25. Регулирование межнациональных отношений и этносоциальных конфликтов в современном мире: потенциал гражданской идентичности (сравнительный политический анализ). Грант Российского научного фонда. Институт мировой экономики и международных отношений РАН. Эксперт проекта.

26. *Снапкоўская, С. В.* Культуралагічная думка Беларусі : вучэб. дапам. / С. В. Снапковская, К. У. Антановіч. Мінск : РІВШ, 2017. – 216 с. : іл.

# БІБЛІЯГРАФІЧНЫ ПАКАЗАЛЬНІК

## Спіс навуковых прац прафесара С. В. Снапкоўскай


### 1989

1. *Снапкоўская, С. В.* Аб педагагічнай дзейнасці Цёткі па адраджэнню і распаўсюджванню роднай мовы на Беларусі / С. В. Снапкоўская // Весн. Беларус. дзярж. ун-та. Сер. 4, Філалогія, журналістыка, педагогіка, псіхалогія. – 1989. – № 3. – С. 66–69.

2. *Снапкоўская, С. В.* Аб педагагічных ідэях у апавяданнях Якуба Коласа «Казкі жыцця» / С. В. Снапкоўская // Каласавіны : тэз. дакл. і паведамленняў навук. канф., прысвеч. 107-й гадавіне з дня нараджэння Я. Коласа і 30-годдзю адкрыцця музея песняра / склад. М. Д. Мацюх. – Мінск, 1989. – С. 28–29.

### 1991

3. *Снапковская, С. В.* Проблема белорусской национальной школы и ее освещение в курсе педагогики / С. В. Снапковская // Научно-методические проблемы преподавания в вузе : тез. докл. науч.-метод. конф. преподавателей и сотрудников БГУ, Минск, 17–18 апр. 1991 г. / редкол.: П. В. Бригадин [и др.]. – М., 1991. – С. 151–152.

4. *Снапкоўская, С. В.* На шляху да беларускай нацыянальнай школы : Максім Багдановіч і педагогіка / С. В. Снапкоўская // Беларус. мова і літаратура у шк. – 1991. – № 7/8. – С. 128–129.

5. *Снапкоўская, С. В.* Праблема роднай мовы ў педагагічнай думцы Беларусі ў пачатку ХХ ст. / С. В. Снапкоўская // Весці АН БССР. Сер. грамадскіх навук. – 1991. – № 4. – С. 23–28.

6. *Снапкоўская, С. В.* Сялянская школа і земствы на Беларусі ў пачатку ХХ ст. / С. В. Снапкоўская // Современная специфика учебно-воспитательного процесса сельской школы : тез. докл. и сообщ. на респ. науч.-практ. конф., Молодечно, 27–29 нояб. 1990 г. – [Минск], 1991. – С. 27–29.

7. *Снапкоўская, С. В.* Якуб Колас – прадаўжальнік прагрэсіўных тэндэнцый у стварэнні вучэбных кніг на роднай мове / С. В. Снапкоўская // Каласавіны : тэз. дакл. і паведамленняў навук. канф., прысвеч. 109-й гадавіне з дня нараджэння і 85-годдзя пачатку літаратурнай дзейнасці Я. Коласа / склад. М. Д. Мацюх. – Мінск, 1991. – С. 39–43.

## 1992

8. *Снапковская, С. В.* Демократизация школы в Белоруссии в конце XIX – начале XX вв. / С. В. Снапковская // Современные проблемы историко-педагогических исследований : тез. докл. и сообщ. – М., 1992. – С. 208–212.

9. *Снапковская, С. В.* Общественно-педагогическое движение и педагогическая мысль в Белоруссии (90-е годы XIX в. – 1917 г.) : дис. ... канд. пед. наук : 13.00.01 / С. В. Снапковская. – Минск, 1990. – 201 с.

10. *Снапковская, С. В.* Общественно-педагогическое движение и педагогическая мысль в Белоруссии (90-е годы XIX в. – 1917 г.) : автореф. дис. ... канд. пед. наук : 13.00.01 / С. В. Снапковская ; Бел. НИИ образования. – Минск, 1990. – 19 с.

11. *Снапкоўская, С. В.* За школу, за мову, за долю : дэмакратызацыя школы на Беларусі пад уплывам рэвалюцыі 1905–1907 гг. / С. В. Снапкоўская // Адукацыя і выхаванне. – 1992. – № 11. – С. 69–74.

12. *Снапкоўская, С. В.* Народна-выхаўчыя ідэі ў педагагічнай спадчыне Якуба Коласа : (дакастрычніцкі перыяд) / С. В. Снапкоўская // Каласавіны : тэз. дакл. і паведамленняў навук. канф.: да 110-годдзя з дня нараджэння Я. Коласа / склад. М. Д. Мацюх. – Мінск, 1992. – С. 48–50.

## 1993

13. *Русава, С. Ф.* Да пытання аб беларускай школе [на пачатку XX ст.] / С. Ф. Русава ; пер. на беларус. мову П. І. Ляўта ; навук. рэд. С. В. Снапкоўская // Адукацыя і выхаванне. – 1993. – № 7/8. – С. 21–25.

14. *Снапковская, С. В.* Педагогическая журналистика как фактор развития педагогической мысли Беларуси в начале XX в. / С. В. Снапковская // Историко-педагогические исследования и проблемы стратегий развития современного отечественного образования : тез. докл. и выступлений на 13-й сес. Науч. Совета по проблемам истории образования и педагогической науки, Москва, 25–26 мая 1993 г. – М., 1993. – С. 95–98.

15. *Снапковская, С. В.* Ведущие тенденции развития белорусской школы начала XX в. / С. В. Снапковская // Историко-педагогический процесс и современные проблемы образования : методология, идеи, опыт : тез. докл. и выступлений на 14-й сес. Науч. Совета по проблемам истории образования и пед. науки, Москва, 27–28 сент. 1993 г., посвящ. 75-летию со дня рождения и 50-летию науч.-практ. деятельности З. И. Равкина. – М., 1993. – С. 125–128.

16. *Снапкоўская, С. В.* Аб пераемнасці ў сістэме педагагічнай адукацыі на Беларусі ў другой палове XIX ст. / С. В. Снапкоўская // Учебные заведения нового типа в национальной системе образования : материалы Респ. науч.-метод. семинара, Минск, 20–23 апр. 1992 г. / [под ред. А. П. Сманцера, А. В. Козулина]. – Минск, 1993. – С. 177–180.

17. *Снапкоўская, С. В.* Гісторыка-педагагічныя каштоўнасці як фактар развіцця педагагічнай думкі на Беларусі / С. В. Снапкоўская // Фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці студэнтаў : зб. навук. арт. / Мінскі дзярж. пед. ін-т імя А. М. Горкага. – Мінск, 1993. – С. 116–119.

18. *Снапкоўская, С. В.* За адзіную навуковую прастору / С. В. Снапкоўская // Адукацыя і выхаванне. – 1993. – № 2. – С. 111–112.

19. *Снапкоўская, С. В.* Ля вытокаў народнай мудрасці : (А. Я. Багдановіч і выхаванне сродкамі народнай педагогікі) / С. В. Снапкоўская // Адукацыя і выхаванне. – 1993. – № 6. – С. 87–93.

20. *Снапкоўская, С. В.* Максім Багдановіч і беларуская нацыянальная школа / С. В. Снапкоўская // Пачатковая школа. – 1993. – № 5. – С. 32–34.

21. *Снапкоўская, С. В.* Праблема гуманізацыі школы на Беларусі ў пачатку XX ст. / С. В. Снапкоўская // Гістарычная навука і гістарычная адукацыя ў Рэспубліцы Беларусь (новыя канцэпцыі і падходы) : Усебеларус. канф. гісторыкаў, Мінск, 3–5 лют. 1993 г. : у 2 ч. – Мінск, 1993. – Т. 1. – С. 140–142.

22. *Снапкоўская, С. В.* Сістэма народнага выхавання ў паэме Якуба Коласа «Новая зямля» / С. В. Снапкоўская // Каласавіны : матэрыялы навук. канф., прысвеч. 120-годдзю з дня нараджэння нар. паэта Беларусі Я. Коласа «Творчая спадчына Я. Коласа ў кантэксце сучас. літ. працэсу» / склад.: Г. І. Зайцава, М. Н. Далідовіч. – Мінск, 1993. – С. 37–40.

23. *Снапкоўская, С. В.* «Сынам маладой Беларусі...» : педагагічная спадчына Вацлава Ластоўскага / С. В. Снапкоўская // Роднае слова. – 1993. – № 10. – С. 38–41.

24. *Снапкоўская, С. В.* Тэарытычныя асновы шматузроўневай сістэмы падрыхтоўкі настаўнікаў / С. В. Снапкоўская // Учебные заведения нового типа в национальной системе образования : материалы Респ. науч.-метод. семинара, Минск, 20–23 апр. 1992 г. / [под ред. А. П. Сманцера, А. В. Козулина]. – Минск, 1993. – С. 68–72.

25. *Снапкоўская, С. В.* Уплыў падручнікаў Вацлава Ластоўскага на выхаванне самасвядомасці беларускіх дзяцей / С. Снапкоўская // Беларусіка. Кн. 2 : Фарміраванне і развіццё нацыянальнай самасвядомасці беларусаў : матэрыялы Міжнар. навук. канф., Маладзечна, 19–20 жн. 1992 г. / [рэд.: А. Анціпенка і інш.]. – Мінск, 1993. – С. 144–149.

**1994**

26. *Снапковская, С. В.* Аксиологическое значение первых белорусских учебных книг начала XX в. / С. В. Снапковская // Аксиологические аспекты историко-педагогического обоснования стратегии развития отечественного образования : тез. докл. и выступлений на 15-й сес. Науч. совета по проблемам истории образования и педагогической науки, Москва, 17–18 мая 1994 г. – М., 1994. – С. 170–173.

27. *Снапкоўская, С. В.* Педагагічная постаць маладога настаўніка Якуба Коласа / С. В. Снапкоўская // Каласавіны : матэрыялы навук. канф. «Публіцыстыка Якуба Коласа ў сістэме цэласнага рэалістычнага адлюстравання жыцця», лістап. 1994 г. – Мінск, 1994. – С. 97–101.

**1995**

28. *Снапкоўская, С. В.* Агульны раздзел / С. В. Снапкоўская // Асвета і педагагічная думка на Беларусі: са старажытнасці да пачатку XX ст. : бібліяграфічны паказальнік : у 2 ч. / Г. Р. Сянькевіч [і інш.] ; пад рэд. С. В. Снапкоўскай (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 1995. – Ч. 1. – С. 12–24, 40–51, 54–60.

29. *Снапкоўская, С. В.* Асвета і педагагічная думка (другая палова XIX ст. – 1917 г.) / С. В. Снапкоўская // Асвета і педагагічная думка на Беларусі: са старажытнасці да пачатку XX ст. : бібліяграфічны паказальнік : у 2 ч. / Г. Р. Сянькевіч [і інш.] ; пад рэд. С. В. Снапкоўскай (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 1995. – Ч. 2. – С. 7–9, 19–55, 159–185, 195–198, 200–205.

30. Асвета і педагагічная думка на Беларусі: са старажытнасці да пачатку XX ст. : бібліяграфічны паказальнік : у 2 ч. / Г. Р. Сянькевіч [і інш.] ; пад рэд. С. В. Снапкоўскай (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 1995. – 2 ч.

31. *Снапковская, С. В.* Педагогическое образование в Беларуси (XIX – нач. XX вв.) : официальная политика и тенденции утверждения личностно-ориентированных ценностей в творческой деятельности / С. В. Снапковская // Ценностные ориентации в сфере педагогического образования: история и современность : тез. докл. и выступлений на 16-й сес. Науч. Совета по проблемам истории образования и педагогической науки, Москва, 16–17 мая 1995 г. : в 2 т. – М., 1995. – Т. 1. – С. 44–48.

32. *Снапкоўская, С. В.* Вучылішчы / С. В. Снапкоўская // Беларусь : энцыкл. даведнік / рэдкал.: Б. І. Сачанка (гал. рэд) [і інш.]. – Мінск, 1995. – С. 574.

33. *Снапкоўская, С. В.* Гісторыка-педагагічныя даследаванні на Беларусі як сродак інтэнсіфікацыі педагагічнага працэсу / С. В. Снапкоўская // Пути повышения качества профессиональной подготовки педагогических кадров с университетским образованием : материалы Респ. науч.-практ. конф., Минск, 9–10 окт. 1995 г. – Минск, 1995. – С. 188–191.

34. *Снапкоўская, С. В.* Ля вытокаў нацыянальнай педагогікі: з гісторыі школьнай і педагагічнай думкі Беларусі канца XIX – пачатку XX ст. / С. В. Снапкоўская. – Мінск : Нар. асвета, 1995. – 129 с.

35. *Снапкоўская, С. В.* Педагогіка / С. В. Снапкоўская // Беларусь : энцыкл. даведнік / рэдкал.: Б. І. Сачанка (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 1995. – С. 178–179.

36. *Снапкоўская, С. В.* Пра гімназіі / С. В. Снапкоўская // Беларусь : энцыкл. даведнік / рэдкал.: Б. І. Сачанка (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 1995. – С. 595.
37. *Снапкоўкая, С. В.* Шляхі выхавання нацыянальнай самасвядомасці ў педагагічнай спадчыне Вацлава Ластоўскага / С. В. Снапкоўская // Беларусіка. 4 : Яўрэйская культура Беларусі і яе ўзаемадзеянне з беларускай і іншымі культурамі ; Вацлаў Ластоўскі – выдатны дзеяч беларускага адраджэння / рэд. В. Рагойша, Г. Цыхун, З. Шыбека. – Мінск, 1995. – С. 255–262.
38. *Snapkovskaya, S.* Historical-pedagogical studies in Belarus / S. Snapkovskaya // International Guide for Research in the History of Education : intern. stating conf. for the History of education / ed. Pierre Caspard. – Bern, 1995. – P. 35–40.

**1996**

39. Народная педагогіка беларусаў / У. М. Конан [і інш.] ; рэдкал.: В. К. Бандарчык, М. Ф. Піліпенка, С. В. Снапкоўская. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 1996. – 166 с.
40. *Снапкоўская, С. В.* Адукацыя / А. П. Сманцар, С. В. Снапкоўская // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск, 1996. – Т. 1: А – Аршын. – С. 139.
41. *Снапковская, С. В.* Проблемы белорусской национальной школы в педагогической мысли конца XIX – начала XX в. / С. В. Снапковская // Очерки истории науки и культуры Беларуси IX – начала XXвв. / [Г. В. Штыхов и др. ; авт. предисл. П. Т. Петриков] ; АН Беларуси. Ин-т истории, Комис. по истории науки. – Минск, 1996. – С. 188–196.
42. *Снапкоўская, С.* А. Я. Багдановіч і беларуская народная педагогіка / С. Снапкоўская // Народная педагогіка беларусаў / У. М. Конан [і інш.] ; рэдкал.: В. К. Бандарчык, М. Ф. Піліпенка, С. В. Снапкоўская. – Мінск, 1996. – С. 101–106.
43. *Снапкоўская, С. В.* Аднакласнае пачатковае вучылішча / С. В. Снапкоўская // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск, 1996. – Т. 1: А – Аршын. – С. 122.
44. *Снапкоўская, С. В.* Асвета / С. В. Снапкоўская // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск, 1996. – Т. 2 : Аршыца – Беларусцы. – С. 24–25.
45. *Снапкоўская, С.* Беларусь: у цэнтры культурна-педагагічных ўплываў : [са старажытнасці да пачатку XX ст.] / С. Снапкоўская // Адукацыя і выхаванне. – 1996. – № 6. – С.17–34.
46. *Снапкоўская, С. В.* Народна-выхаваўчыя ідэі як фактар развіцця нацыянальнай самасвядомасці беларускіх дзяцей у канцы XIX – пачатку XX ст. / С. В. Снапкоўская // Нацыянальная самасвядомасць і выхаванне

моладзі : зб. навук. прац / Нац. ін-т адукацыі ; навук. рэд. А. С. Лапцёнак, В. А. Салееў. – Мінск, 1996. – С. 21–25.

47. *Снапкоўская, С.* Уплыў народнай педагогікі на развіццё педагагічнай думкі Беларусі ў пачатку XX ст. / С. Снапкоўская // Народная педагогіка беларусаў / У. М. Конан [і інш.] ; рэдкал.: В. К. Бандарчык, М. Ф. Піліпенка, С. В. Снапкоўская. – Мінск, 1996. – С. 107–115.

**1997**

48. *Снапковская, С. В.* Гуманистические ориентиры педагогических технологий в контексте отечественного опыта / С. В. Снапковская // Технообраз'97: технологии непрерывного педагогического образования и творческого саморазвития учителя : материалы II Респ. науч. конф., Гродно, 8–9 апр. 1997 г. – Гродно, 1997. – С. 27–29.

49. *Снапковская, С. В.* Реформирование средней школы в конце 50-х – начале 60-х годов XX в. : опыт и итоги / С. В. Снапковская. – Минск : Нац. ин-т образования, 1997. – 25 с.

50. *Снапковская, С. В.* Тенденции реформирования системы образования в Беларуси : ретроспектива и пути решения // Брестский хронограф : сб. науч. работ / С. В. Снапковская ; Брест. гос. ун-т. – Брест, 1997. – Вып. 1. – С. 79–80.

51. *Снапкоўская, С. В.* Валасныя вучылішчы на тэрыторыі Беларусі / С. В. Снапкоўская // Адукацыя і выхаванне. – 1997. – № 8. – С. 122–124.

52. Снапкоўская, С. В. Гістарычны аналіз станаўлення педагагічнай парадыгмы на Беларусі / С. В. Снапкоўская // Гуманітарна-эканамічны весн. – 1997. – № 3. – С. 104–112.

53. *Снапкоўская, С. В.* Адукацыйныя рэформы на Беларусі ў XX ст.: міф ці рэальнасць? / С. В. Снапкоўская // Пути развития общеобразовательной школы : тез. докл. междунар. науч.-практ. конф. – Минск, 1997. – С. 3–5.

54. *Снапкоўская, С. В.* Асвета на Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст. : стан і тэндэнцыі развіцця / С. В. Снапкоўская // Адукацыя і выхаванне. – 1997. – № 8. – С. 11–23.

55. *Снапкоўская, С. В.* Вышэйшая адукацыя / А. П. Сманцар, С. В. Снапкоўская // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск, 1997. – Т. 4 : Варанецкі – Гальфстрым. – С. 333.

56. *Снапкоўская, С. В.* Шляхі развіцця школы на Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст. / С. В. Снапкоўская. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 1997. – 41 с.

57. *Snapkovskaya, S.* Ausländische pädagogische Einflüsse und Grenzgänge in Belarus von den Anfängen bis 1917 / S. Snapkovskaya, W. Snapkovskij // Pädagogische Grenzgänger in Europa / Elmar Lechner (Hrsg.). – Frankfurt am Main, 1997. – S. 333–350.

## 1998

58. *Снапкоўская, С. В.* Адукацыйная палітыка і школа на Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст. / С. В. Снапкоўская. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 1998. – 191 с.

59. *Снапкоўская, С. В.* Адукацыя / С. В. Снапкоўская // Чалавек і грамадства : энцыклапед. даведнік / У. Л. Абушэнка, Т. І. Адула, В. Г. Аляксееў. – Мінск, 1998. – С. 14–15.

60. *Снапкоўская. С. В.* Асвета на Беларусі : гісторыка-культурны аналіз / С. В. Снапкоўская // Беларускае асветніцтва: вопыт тысячагоддзя : матэрыялы міжнар. кангрэса, Мінск, 20–21 кастр. 1998 г. – Мінск, 1998. – Ч. 1. – С. 41–44.

61. *Снапкоўская, С. В.* Канцэпцыя беларускай нацыянальнай школы: пошукі і дасягненні ў канцы XIX – пачатку XX ст. / С. В. Снапкоўская // Пачатковая школа. – 1998. – № 9. – С. 47–50.

62. *Снапкоўская, С. В.* Педагагічныя погляды В. Ю. Ластоўскага / С. В. Снапкоўская // Адукацыя і выхаванне. – 1998. – № 5. – С. 25–35.

## 1999

63. Нацыянальны інстытут адукацыі – 70 / Б. М. Крайко, В. У. Івашын, С. В. Снапкоўская [і інш.] ; М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 1999. – 136 с.

64. *Снапкоўская, С. В.* Адукацыйная палітыка царызму і педагагічная думка ў Беларусі (60-я гады XIX ст. – 1917 г.) : аўтарэф. дыс. … д-ра гіст. навук : 07.00.02 / С. В. Снапкоўская ; Нац. акад. навук Беларусі, Ин-т гісторыі. – Мінск, 1999. – 40 с.

65. *Снапкоўская, С. В.* Адукацыйная палітыка царызму і педагагічная думка ў Беларусі (60-я гады XIX ст. – 1917 г.) : дыс. … д-ра гіст. навук : 07.00.02 ; 08.10.1999 ; 12.04.2000 / С. В. Снапкоўская. – Мінск, 1999. – 201 л.

66. *Снапкоўская, С. В.* Асвета і пісьменнасць у Беларусі на рубяжы XIX – XX ст. / С. В. Снапкоўская // Гістарычная навука і гістарычная адукацыя ў Рэспубліцы Беларусь: стан і перспектывы развіцця : матэрыялы II Усебеларус. канф. гісторыкаў, Мінск, 10–11 крас. 1997 г. – Мінск, 1999. – С. 105–107.

67. *Снапкоўская, С. В.* Канфесіяльная палітыка ў галіне адукацыі ў Беларусі (60-я гады XIX ст. – 1917 г.) / С. В. Снапкоўская // Адукацыя і выхаванне. – 1999. – № 5/6. – С. 106–110.

68. *Снапкоўская, С. В.* Моўная палітыка царызму ў ґаліне асветы на Беларусі / С. В. Снапкоўская // Пачатковая школа. – 1999. – № 5. – С. 32–33 ; № 7. – С. 31–32.

69. Снапкоўская, С. В. Праблема нацыянальных каштоўнасцей у педагагічнай думцы Расіі / С. В. Снапкоўская // Адукацыя і выхаванне. – 1999. – № 3/4. – С. 78–87.

70. *Снапкоўская, С. В.* Стварэнне земскай школы на Беларусі ў пачатку ХХ стагоддзя / С. В. Снапкоўская // Гісторыя: праблемы выкладання. – 1999. – № 4. – С. 35–45.

## 2000

71. Лекция как форма обучения в медицинском вузе : метод. пособие / Белорус. гос. ин-т усовершенствования врачей, [каф. педагогики и психологии ; разраб. С. В. Снапковской]. – Минск : БелГИУВ, 2000. – 35 с.

72. *Снапковская, С. В.* Краткий конспект курса лекций по педагогике / Л. А. Саватеева, С. В. Снапковская ; Белорус. гос. ин-т усовершенствования врачей, каф. педагогики и психологии. – Минск : БелГИУВ, 2000. – 27 с.

73. *Снапковская, С. В.* Проблемное обучение как средство интенсификации педагогического процесса в системе работы кафедры педагогики и психологии БелГИУВ / С. В. Снапковская // Медицинское образование XXI века : материалы I Междунар. конф., Витебск, 21 апр. 2000 г. – Витебск 2000. – С. 558–562.

74. *Снапкоўская, С. В.* Рэфармаванне сістэмы адукацыі (пачатак XIX – канец ХХ ст.) : пошукі і дасягненні / М. І. Латыш, С. В. Снапкоўская, А. Л. Еўдакімава // Адукацыя і выхаванне. – 2000. – № 8. – С. 63–67.

## 2001

75. Асвета і педагагічная думка на Беларусі : бібліягр. паказ. / Нац. ін-т адукацыі / [склад.: А. Л. Еўдакімава і інш.] ; пад рэд. С. В. Снапкоўскай. – Мінск : НІА, 2001. – Ч. 3 : 1917–1945 гг. – 327 с.

76. Педагогика : [учеб. программа для пед. специальностей вузов] / Белгосуниверситет, Респ. ин-т высш. шк. ; [сост.: Е. Г. Андреева, С. В. Снапковская и др.]. – Минск : [БГПУ], 2001. – 71 с.

77. *Снапкоўская, С. В.* Арлоўскі Я. Ф. / С. В. Снапкоўская // Асветнікі зямлі Беларускай. X – пачатак XX ст. : энцыкл. давед. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2001. – С. 25–26.

